МЕТЭАЗАЛЕЖНАСЦЬ: РЭАЛЬНАСЦЬ АБО ФАНТАЗІЯ? 6

КУНШТАТ — ЗНІКЛЫ ГОРАД МАЙСТРОЎ 8

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

15 ЛІПЕНЯ 2020 г. СЕРАДА

№ 135 (29249)

ЗВЯЗДА

Выбары-2020

ГОНКУ ПРАЦЯГНУЦЬ ПЯЦЁРА

Цэнтральная выбарчая камісія зарэгістравала кандыдатамі ў прэзідэнты Андрэя Дзмітрыева, Ганну Канапацкую, Аляксандра Лукашэнку, Святлану Ціханоўскую і Сяргея Чэрачня. Менавіта ў такім парадку прозвішчы ўдзельнікаў сёлетняй выбарчай кампаніі будуць размешчаныя ў бюлетэнях для галасавання.

ЦВК адмовіла ў рэгістрацыі кандыдату ў прэзідэнты Віктару Бабарыку на падставе парушэння патрабавання Выбарчага кодэкса адносна ўдзелу замежных арганізацый і грамадзян у выбарчай кампаніі. Старшыня ЦВК Лідзія Ярмошына спаслалася на звесткі Камітэта дзяржаўнага кантролю аб фактах выкарыстання Віктарам Бабарыкам замежнай фінансавай дапамогі ў інтарэсах выбарчай кампаніі. Акрамя таго, нагодай для адмовы магла стаць неадпаведнасць пададзенай дэкларацыі аб даходах прэтэндэнта фактычным даходам. На пасяджэнні ЦВК прагучала інфармацыя з матэрыялаў расследавання, якое адбываецца ў гэты час у адносінах да Віктара Бабарыкі.

Неадпаведнасць гадавога даходу жонкі прэтэндэнта, які ўказаны ў дэкларацыі, фактычнаму, а таксама недастатковая колькасць верыфікаваных тэрытарыяльнымі камісіямі подпісаў у падтрымку вылучэння кандыдатам у прэзідэнты сталі нагодай для адмовы ў рэгістрацыі Валерыю Цапкалу.

Алег Гайдукевіч, Юрый Ганцэвіч, Юрый Губарэвіч, Наталля Кісель, Вольга Кавалькова, Мікалай Казлоў, Уладзімір Няпомняшчых і Аляксандр Таболіч, ініцыятыўныя групы якіх раней таксама былі зарэгістраваныя, не падавалі дакументаў на рэгістрацыю іх кандыдатамі.

Японская вярба красуе пад Гомелем

Фота БелТА.

Гэтыя прыгожыя кусты з далёкага азіяцкага вострава па-японску называюцца «хакура». Яны нядрэнна сябе адчуваюць у Гомельскім доследным лясгасе, які па выніках работы летась прызнаны найлепшым у краіне. Начальніку лесагадавальніка Ліліі ГУЛЯЕВАЙ ёсць чым ганарыцца і на што дзівіцца.

ЦЫТАТА ДНЯ

Анатоль ГЛАЗ, начальнік упраўлення інфармацыі і лічбавай дыпламатыі — прэс-сакратар МЗС:

«Беларускі народ сам зробіць свой выбар без падказкі «добразычліўцаў» звонку. Ні Еўрасаюз, ні хто-небудзь іншы з боку не будзе вызначаць ход выбарчага працэсу ў нашай краіне. Мы адкрытыя (і даказваем гэта на практыцы) для раўнапраўнага і ўзаемапаважлівага дыялогу з нашымі еўрапейскімі партнёрамі. І такі дыялог ідзе, прытым з пазітыўнымі вынікамі для кожнага боку, з прамым эфектам для грамадзян Беларусі і ЕС. Але гэта не значыць, што мы пацерпім ціск на нашы судовую, праваахоўную і выбарчую сістэмы, тым больш пагрозы, адкуль бы яны ні зыходзілі».

Ва ўрадзе

Не дзяліць, а быць разам

Прэм'ер-міністры Беларусі і Расіі правялі перагаворы ў Маскве аб супрацоўніцтве ў энергетычнай сферы

Прэм'ер-міністр Беларусі Раман ГАЛОЎЧАНКА адзначыў асаблівы характар беларуска-расійскіх адносін. «Прамыя кантакты і нацэленая на канкрэтныя дасягненні работа на ўрадавым узроўні маюць у цяперашніх умовах прынцыпова важнае значэнне, — сказаў ён. — Новы склад урада захоўвае нацэленасць на дасягненне ўзаемавыгадных рашэнняў па ўсіх актуальных пытаннях. Разлічваем, што саюзніцкі характар нашых адносін дазволіць знаходзіць кампрамісы па ўсіх адчувальных для абодвух бакоў пытаннях. Нават самая прагматычная пазіцыя, на наш погляд, павінна ўлічваць не толькі імгненныя або кароткатэрміновыя камерцыйныя інтарэсы, але і ўвесь комплекс адносін, які складаецца гадамі і дзесяцігоддзямі».

Ва ўмовах пандэміі, крызісных з'яў у эканоміках усяго свету, на думку кіраўніка беларускага ўрада, «трэба не дзяліць, а быць разам і ад гэтага быць мацнейшымі».

Раман Галоўчанка запэўніў, што, нягледзячы на падзенне тавараабароту паміж краінамі, Расійская Федэрацыя застаецца ключавым гандлёвым партнёрам Беларусі. «Мы па тавараабароце, па нашых разліках, на 22 % за мінулы перыяд знізіліся. Сапраўды, расійскі экспарт больш пацярпеў, чым беларускі, гэта звязана ў асноўным з вуглевадародная тэматыкай. Але, вядома, аб'ектыўная прычына гэтаму — не пагаршэнне адносін паміж краінамі, не нейкія сістэмныя праблемы. Гэта знешнеэканамічная кан'юнктура і шэраг іншых крызісаў, якія наклаліся», — пракаментаваў ён.

«Але ўсё ж нельга не адзначыць і не прызнаць той факт, што не менш адчувальным момантам з'яўляецца ўзаемна страчаная выгада ад захаваных бар'ераў, выключэнняў і абмежаванняў па доступе на ўнутраныя рынкі, — дадаў беларускі прэм'ер. — Мы з гэтым змагаемся і на двухбаковай аснове, і ў рамках еўразійскай інтэграцыі. Тым не менш такія факты працягваюць заставацца».

Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.

Запрашальнік

ЛЕТА. ВІЦЕБСК. ФЕСТЫВАЛЬ

Ужо 29-ы раз прагучаць у ліпені прывітальныя акорды міжнароднага фестывалю мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску» — сёлета ўпершыню выключна пад адкрытым небам. З улікам складанай эпідэміялагічнай сітуацыі і закрытасці многіх граніц аргкамітэт вымушаны быў істотна перагледзець і скараціць праграму, тым не менш пакінуўшы ў шчыльным музычным графіку самыя цікавыя, яскравыя і любімыя гледачамі падзеі. Пра апошнія змены ў афішы і асаблівасці сёлетняга форуму напярэдадні яго адкрыцця даведаліся карэспандэнты «Звязды». СТАР. 3

Фота БелТА.

Пачалася акрэдытацыя ўдзельнікаў і гасцей XXIX Міжнароднага фестывалю мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску». На здымку: удзельніца фестывалю Дзіяна АМЕЛЬЧАНКА.

Па палічках

ЧЫМ «ПАДКАРМІЦЬ» ІМУНІТЭТ?

Моц нашага «шчыта ад вірусаў» напрамую залежыць ад таго, што знаходзіцца ў нас на талерцы

— Не існуе ніводнага прадукта харчавання, здольнага знішчыць вірусную інфекцыю: ні «модны» COVID-19, ні банальнае ВРЗ, — кажа намеснік генеральнага дырэктара па стандартызацыі і якасці прадуктаў харчавання РУП «Навукова-практычны цэнтр Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі па харчаванні», кандыдат тэхнічных навук, дацэнт Алена МАРГУНОВА. — Але ёсць шэраг прадуктаў, якія з'яўляюцца імунамадулятарамі. Прытрымліваючыся пэўных рэкамендацый, можна ўзмацніць ахоўныя функцыі арганізма, а значыць, больш эфектыўна супрацьстаяць інфекцыям.

Крыніца жыцця

Вы здзівіцеся, але найважнейшым прадуктам для ўмацавання імунітэту з'яўляецца... вада. Сакрэт у тым, што вада павінна быць якаснай, а з гэтым у сучаснага чалавека вялікія праблемы.

— Каб стаць імунамадулятарам, пітная вада, здабытая з артэзіянскай свідравіны, пры неабходнасці павінна прайсці шэраг такіх спецыфічных тэхналагічных аперацый, як абезжалезванне, памякчэнне, шматступеньчатая фільтрацыя. Чыстыя, вільготныя слізістыя — гэта першы бар'ер на шляху віруса, — адзначае суразмоўніца. СТАР. 6

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

Эксперты прагназуюць рост цэн на нафту да $100 за бараль

У найбліжэйшыя гады цэны на нафту паднімуцца вышэй за адзнаку 100 долараў за бараль з-за скарачэння яе здабычы, а таксама зніжэння інвестыцый у галіну, прыводзіць газета The Wall Street Journal меркаванні шэрагу экспертаў. «Ціск недафінансавання будзе вельмі сур'ёзны. Некаторым вытворцам стане рэальна складана працягваць здабычу», — лічыць аналітык хэдж-фонду Northern Trace Capital Трэвар Вудс. Ён упэўнены, што планка ў 150 долараў за бараль можа быць лёгка дасягнута да 2025 года. Яго калегі, чые думкі таксама прыводзіць WSJ, упэўненыя, што вымушанае прыпыненне прадпрыемстваў, а таксама параліч паветраных перавозак у свеце з-за эпідэміі каранавіруснай інфекцыі ўжо залажылі тэндэнцыю сусветнага зніжэння выдаткаў на сыравіну.

Урад Харватыі скароціць склад кабінета

Склад новага ўрада, кансультацыі адносна якога цяпер праводзіць Андрэй Пленкавіч, лідар партыі «Харвацкая дэмакратычная супольнасць», якая перамагла на парламенцкіх выбарах 5 ліпеня, будзе паменшаны ў параўнанні з папярэднім кабінетам міністраў. «Частка членаў гэтага ўрада застанецца, а частка пяройдзе ў Сабор (аднапалатны парламент. — **«Зв.»**). Частка новых [міністраў. — **«Зв.»**] далучыцца», — адзначыў у гутарцы з журналістамі Пленкавіч, але не ўдакладніў колькасць будучых міністэрстваў. Як інфармаваў лідар ХДС, новы склад кабінета будзе абвешчаны пасля апублікавання Дзяржаўнай выбарчай камісіяй афіцыйных вынікаў. Як вядома, на выбарах у 151-месцавы парламент Харватыі 10-га склікання пераканаўчую перамогу атрымала ХДС — 66 мандатаў плюс яшчэ 10 месцаў кааліцыйных партнёраў.



У Еўропе вырас попыт на дамы на колах

Надышоў сезон адпачынкаў, і на фоне пандэміі каранавіруса ўсё больш людзей адмаўляюцца ад далёкіх пералётаў і перапоўненых гасцініц. Толькі ў маі жыхары ФРГ набылі звыш 10 тысяч новых трэйлераў — амаль на траціну больш, чым летась. У Іспаніі попыт на кемперы таксама вырас — на 20 працэнтаў. Усяго цяпер у Еўропе каля 5 мільёнаў уладальнікаў жылых аўтафургонаў. Прыкладна 2 мільёны «караванаў» ўжо ў дарозе. «Еўрапейскі рынак развіваецца, ён усё больш арыентаваны на маладых, спартыўных людзей. Таму аўтадамы і карыстаюцца такой папулярнасцю, апошнім часам — і ў краінах Усходняй Еўропы», — адзначыў Фрэнк Вілі, камерцыйны дырэктар кампаніі Benimar, якая ўжо больш за 40 гадоў займаецца вытворчасцю і пастаўкай жылых аўтафургонаў, перадае Euronews. Вырасла цікавасць і да арэнды трэйлераў. Толькі на адной з анлайн-платформаў браніравання Yescapa зарэгістравана адпаведных запытаў на 60 працэнтаў больш, чым летась.

КАРАТКА

- Паступленне бюджэтнага пакета дакументаў на 2021 год у парламенце чакаюць восенню.
- **Краіны ЕАЭС маюць намер сумесна рэалізаваць касмічны праект.**
- Колькасць насельніцтва гарадоў-спадарожнікаў Мінска павялічваецца.
- **У пункце пропуску «Дамачава» ўсталявалі новае вагавымяральнае абсталяванне.**
- ЮНІСЕФ у Беларусі і БАТЭ стануць партнёрамі па развіцці інклюзіі праз спорт.
- **Чартары ў Туніс адкладзеныя як мінімум да 22 ліпеня.**
- Танцавальны калектыў БДПУ стаў прызёрам фестывалю Global Internet Dance.
- **Бясплатны анлайн-рэсурс па ўсвядомленым бацькоўстве створаны ў Беларусі.**

АСА АТАКУЕ РАПТОЎНА

Як засцерагчыся ад крылатых агрэсараў?

Пры ўсіх выгодах лета ёсць у ім адзін мінус — рэзка актывізуюцца небяспечныя насякомыя. Восы, пчолы, чмялі і шэршні асабліва заўважны ў цёплае надвор'е і ў другой палове лета, калі спее садавіна. Няпрошаныя госці могуць да вас прычапіцца, калі вы варыце варэнне, праветрываеце пакой без маскітнай сеткі альбо проста выйшлі пагуляць у яркім адзенні. Вынік уджалення можа быць вельмі сумны.

Шырока вядомы выпадак у Слуцку, які адбыўся ў верасні 2018 года. Тады восы атакавалі мужа і жонку — яны вылецелі з саломы на прысядзібным участку і напалі на сужэнцаў. Мужчына атрымаў чатыры ўкусы, але пагаршэння стану не адчуў. А вось жанчыне не пашанцавала — раз'юшаныя насякомыя пачалі яе кусаць у вобласці грудзей і жывата. Пры дапамозе дыхлафосу муж разагнаў рой. Жанчына зайшла ў дом і пачала задыхацца. Медыкі выратаваць яе не здолелі...

Тады ж, у 2018-м, восы сумна адзначыліся і ў Гродне, дзе напалі на дзяцей у садку. Тады ў бальніцу трапіла пяцёра малых. Хэпі-эндам скончылася гісторыя ў Мсціслаўскім раёне, дзе мясцовую жыхарку атакавалі шэршні, — яе, на шчасце, удалося выратаваць супрацоўнікам МНС. СТАР. 5

ISSN 1990 - 763X

Асцярожна, фэйк!

СТРАЦІЦЬ ДАВЕР ЛЁГКА...

Правакацыйныя загалоўкі ў стужках некаторых інфармацыйных агенцтваў вымушаюць задумацца: дзе быў розум (і адказнасць, у тым ліку маральная) у аўтараў «шакіруючых» опусаў?

Чым бліжэйшыя прэзідэнцкія выбары ў Беларусі, тым больш у інтэрнэце праз розныя каналы закідваецца хлусні і лухты (інакш кажучы, фэйкавых навін), накіраваных на дыскрэдытацыю дзяржаўных структур і работы эканомікі. Толькі за мінулы тыдзень сутыкнулася з некалькімі спробамі зняважыць беларускую энергетыку і прамысловасць.

У першым выпадку інфармагенцтва, спасылаючыся на экалагічную грамадскую арганізацыю, сцвярджала пра новыя сведчанні магчымых парушэнняў пры будаўніцтве БелАЭС. Хвалю «аб страчаных дакументах», тэндарах на іх узнаўленне і кампаніях, якія могуць у гэтым удзельнічаць, падхапілі асобныя інтэрнэт-рэсурсы.

«Атрымліваецца, што Беларуская АЭС, якая будавалася дзевяць гадоў, падыходзіць да тэрміну здачы праекта з няпоўным камплектам выканаўчых дакументаў», — рэзюмуюць аўтары фэйкавай навіны.

Адказ на тэлеграм-канале Мінэнерга прагучаў імгненна: ніякай страты не было (гэта па-першае), «НІКІМТ-Атамбуд» здаў выканаўчую дакументацыю ў адносінах работ па будаўніцтве першага энергаблока БелАЭС у поўным аб'ёме (гэта па-другое), тэндар патрэбны для афармлення дублікатаў неабходнай дакументацыі, і (што самае галоўнае) усё астатняе — здагадкі. Каб іх не было, прывёў тлумачэнні інжынірынгавай кампаніі АСЭ, апублікаваныя на яе афіцыйным сайце.

Сапраўды, акцыянернае таварыства «НІКІМТ-Атамбуд» абвясціла конкурс на закупку паслуг, у кароткім апісанні якіх заяўлена аб набыцці паслуг па аднаўленні, вядзенні і здачы выканаўчай дакументацыі на аб'екты будаўніцтва БелАЭС. Каб зразумець, што з гэтага вынікае, прывядзём тлумачэнні цалкам.

«У комплекс паслуг, якія закупляюцца АТ «НІКІМТ-Атамбуд», уваходзіць атрыманне дублікатаў і завераных копій сертыфікатаў, пратаколаў выпрабаванняў і іншых дакументаў. Патрэба ў такіх паслугах абумоўлена той акалічнасцю, што пры атрыманні матэрыялаў пастаўшчык перадае дакументы, якія пацвярджаюць якасць матэрыялаў, што пастаўляюцца (сертыфікаты якасці) у адным (сапраўдным або завераным) экзэмпляры, у той час як выканаўчая дакументацыя падлягае здачы ў чатырох экзэмплярах. Выкананне апісанага працэсу з'яўляецца аднаўленнем выканаўчай дакументацыі, таму што патрабуе арганізацыі працэсу, накіраванага на атрыманне дадатковых экзэмпляраў дакументаў. Падобныя паслугі з'яўляюцца нармальнай практыкай, якая патрабуе вялікіх працавыдаткаў, і не могуць сведчыць аб якіх-небудзь парушэннях, дапушчаных АТ «НІКІМТ-Атамбуд» пры выкананні дагаворных абавязацельстваў у межах рэалізацыі праекта па ўзвядзенні Беларускай АЭС.

Арганізацыя здала выканаўчую дакументацыю ў дачыненні да работ па ўзвядзенні энергаблока № 1 Беларускай АЭС у поўным аб'ёме. Усе закупкі, якія ў цяперашні час вядзе АТ «НІКІМТ-Атамбуд», звязаныя з будаўніцтвам энергаблока № 2 Беларускай АЭС.

Пераможца конкурсу вызначыцца сярод арганізацый, якія пацвердзілі сваю кампетэнцыю ў аказанні такога віду паслуг пасля атрымання ад прэтэндэнтаў дадатковай інфармацыі і завяршэння працэдуры закупкі. З адпаведнай інфармацыяй можна пазнаёміцца на сайце дзяржзакупак».

Калі казаць проста, то будаўнічай арганізацыі, акрамя яе арыгінальнага пакета дакументаў спатрэбілася зрабіць яшчэ чатыры копіі, каб перадаць зацікаўленым бакам. Адпаведна, быў аб'яўлены тэндар на іх выкананне. Усё гэта і стала нагодай для фэйкавага інфармацыйнага ўкіду. Пры гэтым выданні, якія яго падхапілі, не толькі не палічылі патрэбным высветліць сітуацыю, але і прыдумалі нейкіх міфічных прарабаў і псеўдаэкспертаў, галоўнай мэтай якіх стала — сваімі «выказваннямі» дыскрэдытаваць беларускія дзяржструктуры.

Гэтаксама лічыць і забудоўшчык. На яго думку, інфармацыя, апублікаваная на сайце навін, не з'яўляецца аб'ектыўнай, заснавана на здагадках, што сведчыць пра адсутнасць зацікаўленасці ў аб'ектыўным і ўсебаковым асвятленні пытанняў, звязаных з будаўніцтвам БелАЭС, і наўмысным скажэнні фактаў.

Дарэчы, для атрымання вось такіх падрабязных і вычарпальных тлумачэнняў па правядзенні вышэйзгаданага конкурсу грамадскае экалагічнае аб'яднанне, на якое робіцца спасылка ў навіне, у АТ «НІКІМТ-Атамбуд» не звярталася. А навошта, калі можна, як кажуць, хайпануць на загалоўку?!

Яшчэ адзін грубы фэйк стала распаўсюджваць на мінулым тыдні расійскае федэральнае інфармагенцтва. Гэтым разам укід быў накіраваны супраць беларускага ваенна-прамысловага комплексу. Журналісты агенцтва груба сказілі інфармацыю беларускіх СМІ і заявілі, што адна з новых распрацовак ВПК Беларусі — рэактыўная сістэма залпавага агню (РСЗА) «Флейта» — праходзіла выпрабаванні на ўсходзе Украіны, дзе вяла стральбу па жыхарах Данбаса. На такі дзікі па сваім змесце фэйк аператыўна адрэагаваў беларускі Дзяржкамваенпрам.

— Прыведзеныя ў артыкуле тэзісы грунтуюцца на неправераных, некампетэнтных звестках, якія не адпавядаюць рэчаіснасці, з'яўляюцца беспадстаўнымі, неаб'ектыўнымі і не маюць нічога агульнага з рэальнымі абставінамі, — зрабіла афіцыйную заяву на сайце ведамства яго прэс-служба. У камітэце растлумачылі, што ўсе этапы распрацоўкі і папярэднія выпрабаванні рэактыўнай сістэмы залпавага агню праводзяцца выключна на тэрыторыі Беларусі, баявая машына ніводнага разу не пакідала меж краіны. І вось гэта ўжо факты дакладныя.

Цікавасць суседзяў да нашай распрацоўкі, відавочна, узнікла падчас парада да Дня Перамогі, які правёў беларускі бок, — менавіта тут «Флейта» ўпершыню і «засвяцілася» на шырокай публіцы. Што датычыцца далейшага лёсу распрацоўкі айчыннага ваенпраму, то ў прэс-службе ведамства растлумачылі: цяпер вядзецца падрыхтоўка сістэмы да першых палявых выпрабаванняў, якія пройдуць на адным з беларускіх палігонаў.

— У святле гэтага выклікае здзіўленне і ўяўляецца вельмі дзіўнай публікацыя расійскага федэральнага інфармацыйнага агенцтва, якое груба сказіла інфармацыю беларускіх СМІ аб распрацоўцы ваенна-прамысловым комплексам РСЗА «Флейта» для блізкага бою і размясціла правакацыйны фэйк, які далей растыражавалі некаторыя расійскія інтэрнэт-рэсурсы, — адзначылі ў ведамстве. — Мы спадзяёмся, што рэдакцыя ўсё ж захавае аблічча аўтарытэтнага выдання і надалей не будзе крочыць у фарватары кан'юнктурных меркаванняў, будзе прафесійна прытрымлівацца асноўных прынцыпаў журналісцкай этыкі — сацыяльнай адказнасці, аб'ектыўнасці, дакладнасці і добрасумленнасці.

І дадаць тут няма чаго... Калі толькі адно: давер чытача страціць лёгка, і гэта трэба памятаць у пагоні за колькасцю праглядаў і лічбамі перапостаў.

Вольга АЛЯКСАНДРАВА.

Акцэнты

МУС: расхістаць сітуацыю не ўдасца

Міністэрства ўнутраных спраў правяло анлайн-канферэнцыю «Telegram-пагрозы: хто за імі стаіць і каму выгадная дэстабілізацыя ў грамадстве». Спікерам выступіў першы намеснік міністра ўнутраных спраў Генадзь КАЗАКЕВІЧ. Трансляцыя ішла на Youtube-канале МУС.

— Сёлета перадвыбарная кампанія адбываецца ў абставінах нечуванага інфармацыйнага ціску, маніпуляцыі грамадскай думкай, дыскрэдытацыі органаў улады, — адзначыў Генадзь Казакевіч. — Для стварэння негатыўных інфармацыйных нагод, для запалохвання людзей, якія падтрымліваюць дзяржаву, для пастаяннага ўкіду фэйкавых навін, што распальваюць абурэнне грамадзян, шырока выкарыстоўваюцца інтэрнэт-рэсурсы.

Першы намеснік міністра адзначыў высокую хуткасць перадачы інфармацыі і мабільнасць гэтага працэсу.

— Падрыхтоўка чарговых незаконных акцый і вярбоўка новых прыхільнікаў адбываецца на спецыялізаваных інтэрнэт-рэсурсах, закрытых групах у інтэрнэт-месенджарах — перш за ўсё ў Viber, Telegram. Найбольш адыёзныя, радыкальна настроеныя асобы вядуць індывідуальныя відэаблогі і паблік-чаты на Youtube, Facebook, у «ВКонтакте», — заўважыў Генадзь Казакевіч.

На яго думку, тое, што адбываецца ў інфармацыйнай прасторы, — гэта палітычная тэхналогія, скіраваная на разгойданне і дэстабілізацыю сітуацыі.

— Элементам такіх тэхналогій з'яўляецца негатыўнае ўздзеянне ў інфармацыйным полі з мэтай падрыву аўтарытэту органаў улады і кіравання, ачарнення адказных асоб, грамадскіх дзеячаў, супрацоўнікаў праваахоўных органаў. Задачы простыя і зразумелыя. З аднаго боку — спарадзіць недавер і непрыязнасць, а ўрэшце нянавісць грамадзян да існуючага дзяржаўнага ладу, асабліва да супрацоўнікаў органаў унутраных спраў і ваеннаслужачых унутраных войскаў. З іншага боку, стаіць задача расхістаць свядомасць саміх супрацоўнікаў, каб пасеяць у іх няўпэўненасць, спарадзіць страх, немагчымасць або нежаданне выконваць прынятыя на сябе абавязацельствы па ахове грамадскага парадку і барацьбе са злачыннасцю, — заявіў Генадзь Казакевіч.

Ён падкрэсліў, што ведамства бачыць і аналізуе тое, што адбываецца.

— Гэта не мае нічога агульнага з прыгнётам іншадумства. Больш за тое, мы з павагай ставімся да тых грамадзян, якія, не хаваючы сябе, выказваюць сваё бачанне будучага развіцця нашай краіны. Але мы не сцерпім абразы, пагрозы дзяржслужачым, членам выбарчых камісій, журналістам, грамадскім актывістам, нашым супрацоўнікам і членам іх сем'яў. Асабліва калі гэтыя пагрозы здзяйсняюцца ананімна і цішком, — растлумачыў Генадзь Казакевіч.

Першы намеснік міністра ўнутраных спраў асобна спыніўся на падзеях у Гродне, якія адбыліся 29 мая.

— А менавіта арганізацыя і падрыхтоўка дзеянняў, што груба парушаюць грамадскі парадак, альбо актыўны ўдзел у іх. Але цяпер гаворка пойдзе не пра крымінальную справу, заведзеную па артыкуле 342 Крымінальнага кодэкса, а пра тое, што адбывалася «за кадрам», пра тыя ганенні, якія зазналі супрацоўнікі органаў унутраных спраў разам з членамі іх сем'яў , — заўважыў Генадзь Казакевіч.

Па яго словах, сітуацыя доўга аналізавалася, правяраліся факты, высвятляліся датычныя да пагроз, абраз і паклёпу ў інтэрнэце. У прамым эфіры былі прадэманстраваны скрыншоты абразлівых паведамленняў, якія дасылаліся, напрыклад, жонцы аднаго з міліцыянераў. На думку першага намесніка міністра, усе інтэрнэт-карыстальнікі разумеюць, што нічога агульнага з грамадзянскай пазіцыяй і бачаннем будучыні сваёй краіны такія негатыўныя выказванні не маюць. За гэтымі словамі былі паказаны людзі, якія выказвалі падобныя абразы і пагрозы. Генадзь Казакевіч адзначыў, што адзін з іх — 49-гадовы мужчына, які больш за 50 разоў прыцягваўся да адміністрацыйнай адказнасці, другі — 46-гадовы грамадзянін, таксама з багатым «паслужным спісам». Усяго зараз у міліцыі знаходзіцца каля 30 заяў ад тых, хто трапіў пад ганенні або пагрозы ў інтэрнэце.

На пытанне аб тым, ці магчыма заблакіраваць Telegram, як гэта было зроблена ў Расіі, Генадзь Казакевіч адказаў:

— З інфармацыйнага пункту гледжання глупства блакіраваць Telegram-каналы. Інтэрнэт нельга забараніць. Але, тым не менш, у выпадку пагрозы нацыянальнай бяспецы, распаўсюджвання любой дэструктыўнай інфармацыі мы можам эфектыўна блакіраваць доступ карыстальнікаў нацыянальнага сегмента да гэтых рэсурсаў.

Валяр'ян ШКЛЕННІК.

Меркаванне

Мір і незалежнасць перш за ўсё

Мікалай БАРЫСЕНКА, гісторык, ваенны пісьменнік, кіраўнік Магілёўскага абласнога гісторыка-патрыятычнага пошукавага клуба «Віккру»:

— Самае каштоўнае, што ёсць на зямлі, — гэта мір і магчымасць жыць у незалежнай дзяржаве. Мы не павінны забываць, якой цаной была заваяваная Перамога. Мы ў неаплатным даўгу перад тымі, хто перадаў нам у спадчыну мірную краіну. Яны адбудоўвалі разбураныя гарады, наладжвалі вытворчасць. Гэта дало нам магчымасць быць незалежнымі і развівацца. Наша моц — у гістарычнай памяці. Калі яе не будзе, мы страцім сувязь паміж пакаленнямі, і тады знойдуцца тыя, хто перапіша гісторыю і сказіць факты. Азіраючыся назад, мы бачым, што самы лепшы спосаб вырашэння пытання — мірны, без войнаў, рэвалюцый і кровапраліцця. Пакуль мы памятаем пра подзвіг і цяжкую працу нашых продкаў, мы непераможныя.

Я гісторык і пісьменнік, асноўную частку жыцця прысвяціў пошукавай дзейнасці, больш за 30 гадоў узначальваю гісторыка-патрыятычны пошукавы клуб «Віккру». Я рады, што раблю любімую справу на карысць Радзімы. Для патрыятычнага выхавання дзяцей і моладзі вельмі важныя вопыт папярэдніх пакаленняў і генетычная памяць, якая звязвае кожнага з іх са сваімі продкамі. Калі няма такога падмурка, тады лёгка перапісаць гісторыю і пазбавіць чалавека павагі да сваёй роднай краіны.

20 чэрвеня мне пашанцавала мець дачыненне да адкрыцця мемарыяльнага комплексу памяці спаленых вёсак Магілёўскай вобласці ў вёсцы Боркі. Запомніліся словы, што сказаў Прэзідэнт падчас экскурсіі па мемарыяльным комплексе: «Калі, не дай бог, пачнецца вайна, яна не пакіне ў баку нікога, яна ўвойдзе ў кожны дом, а гэта слёзы, кроў і пакуты для ўсіх. Вельмі важна зберагчы мір». Мае думкі сугучныя з гэтымі думкамі. Іх добра разумеюць і ўсе члены клуба «Віккру», бо падчас пошукавых экспедыцый на месцы баёў яны цалкам паглыбляюцца ў атмасферу вайны і бачаць яе непрыхаваную існасць. Міжволі кожны задумваецца: а як бы ў той момант зрабіў я? І, перакананы, робяць выбар на карысць Айчыны. Якая б яна ні была, але яна мая, і я зраблю ўсё магчымае, каб яе абараніць...

Мы жывём сёння ў стабільнай і спакойнай дзяржаве. І толькі ад нас залежыць, якую Беларусь мы перададзім сваім нашчадкам. Любы пераварот — гэта адмаўленне ўсяго таго, што ўжо ёсць, таго, чаго паспела дасягнуць дзяржава.

Запісала Нэлі ЗІГУЛЯ.

ЗАО «БЕЛРЕАЛИЗАЦИЯ» ОБЪЯВЛЯЕТ АУКЦИОН

Организатор торгов: **ЗАО «Белреализация»** (УНП 191113330), 220089, г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 27, тел.: (8017) 298-53-53; (8029) 690 54 09, **BELTORGI.BY.**

Продавец: **ОАО «Трест Белтрансстрой»** (УНП 100120922), 220030, г. Минск, ул. Советская, д. 8. Тел. +375172251985, в лице антикризисного управляющего ООО «Юридическое антикризисное агентство «ВИТКОНСАЛТ».

Первые повторные публичные торги в форме аукциона в процедуре экономической несостоятельности (банкротства) будут проведены **30 июля 2020 г. 10.00** по адресу: г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 27.

№ п/п	Предмет торгов, местонахождение	Начальная цена предмета торгов, бел. руб. с НДС
1	Капитальное строение с инв. № 200/С-500014, площадь – 559,8 кв. м, назначение – здание административно-хозяйственное, наименование – здание конторы, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 240100000002000292 по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. 8-я Свердлова, 4	569 160,00
2	Фок общ. пл. 764,0 кв. м, капитальное строение № 350/С-111202 (назначение – здание специализированное физкультурно-оздоровительного и спортивного назначения), расположенное на земельном участке с кадастровым № 340100000005007703 по адресу: Гомельская обл., г. Гомель, ул. Никольская, 7	585 360,00
3	Производственная база, расположенная по адресу: г. Барановичи, ул. Минский парк, д. 10Б	1 381 213,08
4	Легковой джип Chevrole Niva, рег. № 5205 ЕР-7, 2007 г. в, г. Минск, ул. Казинца, 11	2 808,00
5	Грузопассажирский вагон ГАЗ 2752, рег. № АЕ 0854-7, 2008 г. в., г. Минск, ул. Казинца, 11	1 728,00
6	Грузовой специальный самосвал MAZ 5551, рег. № КВ 2432, 1997 г. в., г. Минск, ул. Бабушкина, 88	3 132,00
7	Грузовой бортовой MAZ 53371, рег. № АВ 9128-7, 1990 г. в., г. Минск, ул. Бабушкина, 88	2 268,00
8	Грузовой бортовой MAZ 53371, рег. № АМ 1137-7, г. в н/у (1998 по инв.), г. Минск, ул. Бабушкина, 88	2 160,00
9	Грузовой специальный кран MAZ 5337, рег. № КС 0163, 1998 г. в., г. Минск, ул. Казинца, 11	10 584,00
10	Гусеничный бульдозер Т-330, инв. № 708, г. в. н/у (1989 по инв.), г. Минск, пр-т Дзержинского, 1Б	12 960,00
11	Вагон-домик, инв. № ССМП101.26, г. в. н/у, Тип ТС – прицеп вагон-бытовка, г. Минск, ул. Казинца, 11	464,40

Тел. для ознакомления и осмотра +375 29 698-53-03.

Для участия в торгах необходимо в срок с 16.07.2020 г. 09.00 по 29.07.2020 г. 17.00: 1) зарегистрироваться и подать заявку по выбранному лоту на участие в торгах на сайте BELTORGI.BY, 2) перечислить задаток по выбранному лоту на р/с BY33BPSB30121854590139330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», код BPSBBY2X, УНП 191113330, получатель – ЗАО «Белреализация».

Шаг торгов – 5 %, задаток – 10 % от начальной цены предмета торгов. Организатор торгов вправе отказаться от их проведения не позднее, чем за пять дней до наступления даты проведения торгов. Торги проводятся при наличии не менее двух допущенных к участию в них участников. Победителем торгов признается лицо, предложившее наиболее высокую цену. Результаты торгов оформляются в виде протокола. Если заявка на участие в торгах подана только одним участником, торги признаются несостоявшимися. Предмет торгов продается претенденту на покупку при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов. Победитель торгов (претендент на покупку) обязан возместить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов, оплатить аукционный сбор в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов. Срок заключения договора купли-продажи и оплаты предмета торгов – в течение 10 рабочих дней со дня проведения торгов. Извещение о ранее проведенных торгах было опубликовано в газете «Звязда» от 14.05.2020 г.

ШВАБСКИЙ СЕЛЬСКИЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ (организатор аукциона) извещает о проведении 20 августа 2020 года открытого аукциона по продаже земельного участка в частную собственность гражданам Республики Беларусь для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома

№ лота	Адрес земельного участка, кадастровый номер	Площадь (га)	Ограничения в использовании, инфраструктура	Начальная цена (бел. рублей)	Размер задатка (бел. рублей)	Расходы по изготовлению документации (бел. рублей)
1	**д. Таковщина, ул. Дачная, д. 63, 623287608601000068,** целевое назначение земельного участка – для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома (земельный участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома) с объектами обслуживания)	0,1896	Имеются подъездные пути	2000,00	400,00	2316,65 + расходы за размещение объявления
2	**д. Логи, ул. Садовая, д. 4А, 623287603601000060,** целевое назначение земельного участка – для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома (земельный участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома) с объектами обслуживания)	0,2372	Имеются подъездные пути, электрифицирован, имеется водоснабжение	2500,00	500,00	1823,83 + расходы за размещение объявления
3	**д. Заберезовка, д. 1Д, 623287601601000048,** целевое назначение земельного участка – для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома (земельный участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома) с объектами обслуживания)	0,1704	Имеются подъездные пути, электрифицирован	2400,00	480,00	1958,59 + расходы за размещение объявления

Дата, время и место проведения аукциона: **20 августа 2020** в 11.00 по адресу: Логойский район, д. Швабы, ул. Парковая, д. 26, Швабский сельский исполнительный комитет.

Прием документов, ознакомление с участком и документацией: ежедневно с 8.00 до 17.00 (кроме субботы и воскресенья) по 14.08.2020 включительно; к заявлению прилагаются квитанция об оплате задатка и копия личного паспорта, соглашение.

Задаток перечисляется на р/с № BY21AKBB36006191611010000000, Минское управление ОАО «АСБ Беларусбанк», БИК банка AKBBBY2X, г. Логойска. УНП 600537220, Швабский сельский исполнительный комитет, код платежа 4901.

Победитель аукциона обязан в течение 10 (десяти) рабочих дней после утверждения о результатах аукциона внести плату за земельный участок, возместить расходы, связанные с подготовкой документации, необходимой для проведения аукциона. Порядок проведения аукциона оговорен в условиях его проведения.

Контактные телефоны: 8 (01774) 59-1-35, 59-2-35, 8 (029) 107-16-17.

Наш сайт в интернете: logoysk.gov.by

Условия: аукцион проводится при наличии двух и более участников**.** Победитель аукциона обязан в течение 10 рабочих дней после подписания протокола о результатах проведения аукциона внести плату за земельный участок и возместить расходы, связанные с организацией и проведением аукциона.

Затраты на строительство, в том числе проектирование объектов распределительной, инженерной и транспортной инфраструктуры к земельному участку, подлежат возмещению в порядке и случаях, предусмотренных постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 01.04.2014 № 298 «Об утверждении Положения о порядке возмещения лицом, которому предоставлен земельный участок, затрат на строительство, в том числе проектирование, объектов распределительной инженерной и транспортной инфраструктуры к такому земельному участку» в соответствии с Указом Президента Республики Беларусь от 07.02.2006 № 72 «О мерах по государственному регулированию отношений при размещении и организации строительства жилых домов, объектов инженерной, транспортной и социальной инфраструктуры».

Информация об объявленном повторном аукционе и предметах повторного аукциона

Организатор аукциона – комитет государственного имущества Минского городского исполнительного комитета

Дата аукциона	Сведения о предметах аукциона	Местонахождение имущества	Начальная цена, руб.	Информация о публикации извещения
05.08.2020	**Лот № 1** Стационарная автогазозаправочная станция (сооружение), 39,6 кв. м, с инженерными коммуникациями, объектами внешнего благоустройства, газоном, оборудованием. Право заключения договора аренды земельного участка площадью 0,3773 га, срок аренды – 5 лет со дня утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона либо признании аукциона несостоявшимся	г. Минск, ул. Уборевича, 109	1 287 568,79 (с понижением начальной цены продажи на 50 %)	Извещение о проведении аукциона опубликовано на https://au.nca.by/item/23753 и https://minsk.gov.by/ru/freepage/other/prodazha_arenda/
	Лот № 2 Стационарная автогазозаправочная станция (сооружение), 50,7 кв. м, с инженерными коммуникациями, объектами внешнего благоустройства, газоном, оборудованием. Право заключения договора аренды земельных участков площадью 0,1878 га, 0,0194 га, 0,0010 га, срок аренды – 5 лет со дня утверждения в установленном порядке протокола о результатах аукциона либо признании аукциона несостоявшимся	г. Минск, ул. Наполеона Орды, 10	1 054 307,41 (с понижением начальной цены продажи на 50 %)	Извещение о проведении аукциона опубликовано на https://au.nca.by/item/23754 и https://minsk.gov.by/ru/freepage/other/prodazha_arenda/

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению Стародорожского районного потребительского общества (продавец) проводит открытый аукцион по продаже одним лотом

СКЛАДА 5 ТАРНОГО

с инв. № 645/С-4871 общей площадью 504,5 кв. м,

СКЛАДА 3 ПРОМТОВАРНОГО

с инв. № 645/С-4931 общей площадью 396,3 кв. м, расположенных на земельном участке с кадастровым номером 625250100029000171 площадью 0,2988 га *(право постоянного пользования)* **по адресу: Минская область, г. Старые Дороги, ул. Кирова, 64/1, 64/3.**

Начальная цена с НДС (20 %) – **175 000,00** бел. руб.
(задаток 10 % от начальной цены – **17 500,00** бел. руб.).

Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 5 (пяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 5 (пяти) рабочих дней после проведения аукциона, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Победитель (единственный участник) аукциона оплачивает Организатору аукциона вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона в размере 4 (четырех) процентов от цены продажи объекта. Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.rlt.by.**

Аукцион состоится **19.08.2020** в **12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **18.08.2020** до **16.00** по указанному адресу.

Тел.: 8 (017) 516-80-65, 516-80-64, 8 (029) 102-21-17.

УНН 600026835

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению Стародорожского районного потребительского общества (продавец) проводит открытый аукцион

ПО ПРОДАЖЕ КВАРТИРЫ

с инв. № 645/D-2501 общей площадью 73 кв. м, квартира состоит из 3 (трех) комнат и расположена в многоквартирном жилом доме 1993 года постройки по адресу: Минская область, Стародорожский район, г. Старые Дороги, ул. Свердлова, 37, кв. 2

Начальная цена – **70 000,00** бел. руб.
(задаток 10 % от начальной цены – **7 000,00** бел. руб.).

Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 5 (пяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 5 (пяти) рабочих дней после проведения аукциона, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Победитель (единственный участник) аукциона оплачивает Организатору аукциона вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона в размере 3 (трех) процентов от цены продажи объекта.

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.rlt.by.**

Аукцион состоится **19.08.2020** в **12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **18.08.2020** до **16.00** по указанному адресу.

Тел.: 8 (017) 516-80-65, 516-80-64, 8 (029) 102-21-17.

УНН 600026835

РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ» (Организатор аукциона) извещает о проведении открытого аукциона по продаже имущества ОАО «ХИМРЕМОНТ» (Продавец)

Лот № 1, состав: 1. Здание административно-хозяйственное, инв. № 500/С-65858, 560 кв. м. Адрес: г. Минск, ул. Асаналиева, 84/6. 2. Тепловая сеть с инвентарным номером 500/С-1026994. Адрес: г. Минск, ул. Асаналиева, 84/2 (ЦТП – здание по ул. Асаналиева, 84/2). Земельные участки: 1. Здание административно-хозяйственное (инв. № 500/С-65858) расположено на земельном участке площадью 0,0684 га с кадастровым номером 500000000004006410. Право постоянного пользования. 2. Тепловая сеть (инв. № 500/С-1026994) расположена на земельном участке с кадастровым номером 500000000004006332 (присвоен предварительно). 3. Земельный участок площадью 0,0683 га с кадастровым номером 500000000004006411. Право постоянного пользования.

Начальная цена с НДС – 613 605,55 бел. руб. Задаток – 30 000,00 бел. руб.

Аукцион состоится 17.08.2020 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, каб. 4.

Извещение о проведении аукциона размещено на сайте Организатора аукциона **ino.by.**

☎ Организатор аукциона:

220030, г. Минск, ул. Комсомольская, 11, пом. 9. 8 (017) 324-70-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52 • www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by

УНП 190055182

УНП 300000398

УВАЖАЕМЫЕ АКЦИОНЕРЫ

открытого акционерного общества «Дорожно-строительного треста № 1, г.Витебск»!

29 июля 2020 года в 14.30

состоится внеочередное общее собрание акционеров открытого акционерного общества «Дорожно-строительный трест № 1, г.Витебск». Собрание пройдет по адресу Общества: г. Витебск, ул. Суворова, 16, актовый зал.

Повестка дня собрания:

1. О выплате дивидендов за 1-е полугодие 2020 года.
2. Об утверждении Нормы естественной убыли и потерь сырья, материалов и продукции в процессе транспортирования и хранения, используемых в ОАО «ДСТ-1, г.Витебск».

С материалами, подготовленными к собранию, можно ознакомиться у председателя наблюдательного совета по адресу: г. Витебск, ул. Суворова, 16, с 22 июля по 28 июля 2020 г. (время работы с 8.30 до 17.30) либо 29 июля 2020 г. по месту проведения собрания, контактный телефон (8-0212) 67-09-04.

Дата формирования реестра владельцев акций и список лиц, имеющих право на участие во внеочередном общем собрании акционеров, – 22 июля 2020 г.

Регистрация участников собрания – с 13.45 до 14.15 по месту проведения собрания. Для регистрации при себе иметь следующие документы: акционеру общества – паспорт, представителю акционера – паспорт и доверенность.

УНП 192240128

ИЗВЕЩЕНИЕ

Республиканское унитарное предприятие «Комплекс по оказанию услуг имени П. М. Машерова» уведомляет о проведении 10.08.2020 аукционных торгов по продаже права заключения договора аренды на три года торгового помещения площадью 151,9 кв. метров по просп. Победителей, 23/1 в г. Минске, проводимых в электронной форме на электронной торговой площадке «ТОРГИБЕЛ».

С полной информацией можно ознакомиться на сайтах: http://торги.бел (номер лота – 250620001), https://au.nca.by/auction/2135
Телефоны для справок:
РУП «Институт недвижимости и оценки» – (017) 306-00-57 (029) 550-09-70;
РУП «Комплекс по оказанию услуг имени П. М. Машерова» – (017) 203-06-41.

УНП 700049607

Открытое акционерное общество «Дорожно-строительный трест № 3» СООБЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ВНЕОЧЕРЕДНОГО ОБЩЕГО СОБРАНИЯ АКЦИОНЕРОВ

Собрание состоится 31 июля 2020 года в 11.00 по адресу: г. Могилев, ул. Космонавтов, 23. Собрание будет проводиться в смешанной форме. Дата составления списка лиц, имеющих право на участие в собрании – 20.07.2020 г.

Повестка дня: О выплате дивидендов за 1 полугодие 2020 года.

Регистрация лиц, имеющих право на участие в собрании, будет проводиться 31 июля 2020 г. с 10.00 до 10.45 по адресу: г. Могилев, ул. Космонавтов, 23.

Лицам, имеющим право на участие в собрании, при себе иметь документ, удостоверяющий личность (для представителей акционеров – доверенности, зарегистрированные в соответствии с действующим законодательством).

Справки по телефонам: **28-40-20, 23-64-24** – ОЭАиП, Наблюдательный совет.

Металургія

Усе вытворчасці працуюць практычна з поўнай загрузкай

Пра гэта паведаміў на прэс-канферэнцыі генеральны дырэктар ААТ «Беларускі металургічны завод — кіруючая кампанія холдынга «Беларуская металургічная кампанія» Дзмітрый КОРЧЫК.

«Беларускі металургічны завод за паўгоддзе экспартаваў прадукцыі, калі казаць у натуральным выражэнні, каля 92 %. Так, ёсць зніжэнне, але яно не крытычнае. Гэта звязана з закрыццём шэрагу вытворчасцяў і зніжэннем заказаў як у аўтамабільнай прамысловасці, так і нафтавай галіне», — адзначыў генеральны дырэктар.

БАНКІРЫ ПАДСТАВІЛІ ПЛЯЧО

Натуральна, на эканоміцы завода апошнім часам адбілася зніжэнне цэн на металапрадукцыю. Але дзякуючы падтрымцы банкаўскай сістэмы і ўрада прадпрыемству ўдалося вытрымаць удар. Нягледзячы на складаныя знешнія ўмовы, у цэлым, па словах генеральнага дырэктара, сёння завод функцыянуе стабільна. «Усе вытворчасці працуюць — дзесьці з невялікім зніжэннем, але практычна з поўнай загрузкай. Мы забяспечаны сыравінай і матэрыяламі», — сказаў Дзмітрый Корчык.

Яшчэ кіраўнік БМЗ заўважыў, што падчас пандэміі прадпрыемства не сышло са сваіх традыцыйных рынкаў і ў няпростых умовах стабільна забяспечвала выпуск прадукцыі на заказ з неабходнай высокай якасцю. «У прынцыпе, па дынаміцы ліпеня мы бачым, што павялічваюцца заказы на металапрадукцыю еўрапейскіх аўтамабільных заводаў, перш за ўсё па металакордзе», — дадаў ён.

ЦУДА-ЧЫГУН ДЛЯ ЕЎРАПЕЙЦАЎ

Дзмітрый Корчык асобна спыніўся на новых распрацоўках. Ён падкрэсліў, што дзякуючы выключна інвестыцыйным укладанням, якія былі зроблены ў апошнія гады, на вытворчасці сёння ёсць магчымасць актыўна займацца новымі відамі марак сталі ў адпаведнасці з досыць высокімі патрабаваннямі аўтавытворцаў, у першую чаргу еўрапейскіх. Паводле яго слоў, за мінулы год было асвоена каля 265 новых відаў вырабаў. Зараз працэдуры апрабавання і сертыфікацыі праходзіць яшчэ каля паўсотні. Асабліва варта ўдзяліць павышаную ўвагу новым гатункам чыгуну з надзвычай высокімі характарыстыкамі.

Варта адзначыць, што БМЗ актыўна супрацоўнічае з акадэмічнымі інстытутамі, у прыватнасці з БНТУ. «У нас ёсць каледж у Жлобіне — філіял БНТУ. Усім маладым спецыялістам гэтай установы, а гэта каля 90 %, мы даём работу на прадпрыемстве. У 2017 годзе наш вытворчы гігант атрымаў статус навуковай арганізацыі, больш за 260 нашых супрацоўнікаў займаюцца новымі распрацоўкамі», — расказаў генеральны дырэктар.

Па ўзроўні вытворчасці прамысловай прадукцыі Беларускі металургічны завод займае вядучае месца сярод прадпрыемстваў Беларусі. Колькасць занятых тут перавышае 12 тысяч чалавек. «Ён стаў найбуйнейшым прадпрыемствам падобнага профілю ў Еўропе і з'яўляецца высокатэхналагічнай структурай металургічнай галіны. Складаецца з чатырох звязаных адным тэхналагічным ланцужком вытворчасцяў — металургічнай, пракатнай, трубнай, метызнай — і цэхаў інфраструктуры. Штогод больш за 80 % вырабленай заводам прадукцыі адпраўляецца на экспарт», — падкрэсліў Дзмітрый Корчык.

Сяргей КУРКАЧ.

Фінансавая палітыка

Рэгулятар параіў банкам не хітрыць з працэнтамі па крэдытах

Такая выснова напрошваецца сама сабой, калі чытаеш ліст Нацбанка, які фінансавы рэгулятар накіраваў беларускім банкам у сувязі з выяўленымі падчас праверак парушэннямі.

Як вядома, у адпаведнасці з Банкаўскім кодэксам крэдытадавец не мае права ў аднабаковым парадку павялічваць памер працэнтаў за карыстанне крэдытам. Гэта сапраўды так, але разам з тым у некаторых крэдытных дагаворах асобных банкаў замацавана права банка павялічыць памер працэнтнай стаўкі. Пагадзіцеся, глупства нейкае атрымліваецца. Таму ў Нацбанку звярнулі на гэта ўвагу і лічаць, што наяўнасць у дагаворах падобных умоў не адпавядае патрабаванням заканадаўства. Каб падобных супярэчнасцяў у далейшым не ўзнікала, Нацыянальны банк звярнуў увагу фінансавых інстытутаў на неабходнасць няўхільна выконваць патрабаванні заканадаўства па крэдытных дагаворах.

Акрамя таго, было выяўлена, што асобныя банкі не прытрымліваюцца рэкамендацыі аб зніжэнні павышанага памеру працэнтаў па крэдыце для тых, хто не вярнуў крэдыт у тэрмін, а таксама рэкамендацыі аб суразмернасці штрафаў. Так, у крэдытных дагаворах некаторых банкаў прадугледжана, што за нясвоечасовае вяртанне крэдыту працэнтная стаўка павялічваецца ў 2—3 разы.

Галоўны банк краіны лічыць, што прымяненне такіх павышаных працэнтаў можна расцэньваць як дадатковую штрафную санкцыю за парушэнне ўмоў крэдытнага дагавора. Акрамя таго, крэдытаатрымальнікі абавязаныя выплаціць пеню ў памеры ад 0,01 % да 3 % за кожны дзень пратэрміноўкі альбо штраф. Гэта не адпавядае рэкамендацыі Нацбанка аб неўжыванні двух і больш відаў штрафных санкцый за адно парушэнне. Атрымліваецца, што асобным банкам рэкамендацыі рэгулятара як пусты гук?

У Нацыянальным банку мяркуюць, што такая фінансавая нагрузка не толькі не стымулюе да своечасовага выканання абавязацельстваў крэдытаатрымальнікамі, але і прыводзіць да яго немагчымасці. Таму фінансавы рэгулятар краіны рэкамендуе прыслухацца да яго парад больш уважліва.

Цяпер банкам неабходна прыняць меры, каб адпавядаць патрабаванням заканадаўства пры заключэнні і выкананні крэдытных дагавораў, забяспечыць суразмернасць штрафных санкцый з панесенымі банкам выдаткамі, а таксама знізіць павышаныя працэнты. Даць справаздачу аб праведзенай рабоце банкі павінны не пазней першых дзён жніўня.

Сяргей КУРКАЧ.

Жывая памяць

«КАЦЮША» КАЛЯ ПАДНОЖЖА КУРГАНА

Легендарную «Кацюшу» ўчора ўстанавілі ў музеі ваеннай тэхнікі пад адкрытым небам каля Кургана Славы

Ва ўрачыстым мітынгу ўзялі ўдзел ветэраны Вялікай Айчыннай вайны і працы, моладзь, прадстаўнікі органаў улады, кіраўніцтва Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі. Дата адкрыцця экспаната абраная невыпадкова. Менавіта ў гэты дзень — 14 ліпеня 1941 года — пад Оршай прагрымеў першы залп гэтай славутай баявой машыны.

Фота БелТА.

Работы па пошуку і рэстаўрацыі «Кацюшы» вяліся каля года. Частка дэталяў была выраблена на аснове ўзораў з Ваенна-гістарычнага музея артылерыі Санкт-Пецярбурга, а вось пульт кіравання стральбой, часткі абліцоўкі, колы і дыскі былі знойдзеныя пошукавікамі ў Ленінградскай вобласці і адноўлены беларускімі рэстаўратарамі.

З'яўленне баявой машыны каля Кургана Славы стала магчымым дзякуючы агульным намаганням усіх галіновых прафсаюзаў. Яшчэ ў студзені быў абвешчаны старт збору сродкаў на папаўненне экспазіцыі музея. Акрамя таго, на добраўпарадкаванне новага манумента былі выдаткаваныя грошы, зароблены падчас рэспубліканскага суботніка.

Здарэнні

ЗГУБІЛАСЯ ЦЭЛАЯ ВЁСКА

Не папаўняйце гэты спіс

Больш за 60 чалавек (фактычна насельніцтва невялічкай вёскі) заблудзілася ў лясах з пачатку года. Іх шукалі ратавальнікі сумесна з работнікамі іншых ведамстваў і валанцёрамі. Пра гэта расказаў начальнік упраўлення аварыйна-выратавальных службаў і ліквідацыі надзвычайных сітуацый МНС Сяргей НОВІК.

За два гады існавання пошукава-выратавальнай службы МНС (яна была створана ў маі 2018 года) ратавальнікі сумесна з работнікамі міліцыі, лясной гаспадаркі і валанцёрамі ўжо знайшлі 768 чалавек, якія згубіліся, у тым ліку 65 дзяцей.

«У сярэднім за год губляецца 350-400 чалавек па краіне. У 2018-м было знойдзена 279 чалавек, з іх 31 дзіця, у 2019-м — 425 дарослых і 26 дзяцей, за шэсць месяцаў 2020-га — 64 чалавекі, з іх восем дзяцей», — праінфармаваў Сяргей Новік.

Ён расказаў, што цяпер штодня знікаюць у лясах два-тры чалавекі. Як правіла, гэта дарослыя. «Часта губляюцца бабулі, дзядулі, якія забываюць узяць з сабой мабільны, забываюць папярэдзіць дзяцей, унукаў», — сказаў начальнік упраўлення.

Каб не згубіцца ў лесе, перад выхадам варта вывучыць карту мясцовасці, узяць тэлефон з навігатарам і поўнай зарадкай, мінімальную аптэчку, ваду, запалкі, невялікі запас ежы. Перад паходам у лес лепш паведаміць сваякам або знаёмым пра меркаваны маршрут і час вяртання. Калі маеце кампанію, можна скарыстацца свістком. Яго гук чуваць за 2-3 кіламетры. Не варта надзяваць камуфляж — адзенне павінна быць шчыльнае і яркае. Не перашкодзяць чырвоная кепка, хустка або любы прыкметны прадмет. У пахмурнае надвор'е паход лепш адкласці.

ДВОЕ СЛУХАЛІ МУЗЫКУ...

У Гомелі расследуюць двайное забойства

У аўторак ноччу ў Гомелі таксіст ехаў па вуліцы Дворнікава і знайшоў каля праезнай часткі мужчыну з раненнямі. На месца здарэння выклікалі хуткую дапамогу і міліцыю. Медыкі, якія прыбылі, канстатавалі смерць мужчыны. У альтанцы на дваровай тэрыторыі недалёка ад праезнай часткі следчыя выявілі другога мужчыну без прыкмет жыцця.

Папярэдне ўстаноўлена, што два мясцовыя жыхары ва ўзросце 32 і 38 гадоў ноччу ў гэтай альтанцы гучна слухалі музыку. «Ім былі нанесены цялесныя пашкоджанні, ад якіх яны памерлі», — адзначылі ў СК.

Узбуджаная крымінальная справа па пункце 1 часткі 2 артыкула 139 КК (забойства дзвюх асоб). Асобу злачынца і відавочцаў здарэння ўстанаўліваюць. Прызначаны экспертызы.

Грамадзян, якім што-небудзь вядома пра злачынства, просяць патэлефанаваць па нумары (8 029) 743-75-45 або 102.

Паводле БелТА.

Таксама непажадана хадзіць па зямлі басанож. Справа ў тым, што на «нулявым узроўні» восы і шэршні любяць уладкоўваць свае гнёзды. Калі вы незнарок наступіце на іх гняздо ці на іх саміх — яны расцэняць гэта як напад і пачнуць атакаваць. Гэта можа адбыцца і тады, калі вы пачняце адмахвацца ад залішне надакучлівай асы. У памяшканнях не будзе лішнім павесіць маскітныя сеткі. Калі насякомае трапляе ў замкнутае памяшканне — яно ўспрымае гэта як пастку і становіцца больш агрэсіўным.

Але што ж зрабіць, калі атакі пчалы ці асы пазбегнуць усё ж не ўдалося? Смяротныя выпадкі звязаны з трыма фактарамі. Гэта колькасць укусаў, якая ўплывае на дозу атруты, месца, куды прыйшлася атака, і адчувальнасць арганізма да яду.

— Вельмі небяспечныя месцы — твар і шыя, — акцэнтуе ўвагу Марына Зямчонак. — Незалежна ад таго, ёсць у вас алергія ці не, трэба тут жа выкарыстаць антыгістамінны сродак. Калі ў іншых месцах цела чырвань і ацёчнасць праходзяць праз два-пяць дзён, то тут трэба амаль паўтара тыдня. Тым больш калі ўкусы былі шматлікія. Доза яду, уведзенага ў арганізм, у гэтым выпадку вельмі высокая. Павышаецца тэмпература цела, узнікаюць задышка, ваніты, галаўны боль, можна страціць прытомнасць. Але самымі горшымі лічацца ўкусы ў паднябенне. Гэта здараецца, калі чалавек еў нейкі фрукт і не заўважыў асу, якая на яго села. Ацёк можа прывесці нават да асфіксіі.

Трэба ведаць, што падчас атакі аса джала не пакідае, у адрозненне ад пчалы. Таму трэба асцярожна паглядзець, ці засталося штосьці ў ране, і толькі пасля гэтага вымаць джала. Для гэтага лепш за ўсё падыдзе пінцэт. Пры любым пагаршэнні стану трэба тут жа тэлефанаваць у хуткую дапамогу, каб не паспеў развіцца анафілактычны шок, які канчаецца лятальным вынікам.

Калі ж небяспечныя госці пасяліліся ў вас дома, то пазбавіцца ад іх нескладана. Аперацыю трэба пачынаць у начны час, калі восы спяць і не праяўляюць актыўнасці. На ўсялякі выпадак трэба апрануцца ў касцюм, які не пакідае адкрытых участкаў цела. Падстаўляеце мяшок, вострым нажом зразаеце гняздо — і далей можна яго або закапаць, або ўтапіць, або спаліць (вядома ж, з захаваннем усіх проціпажарных нормаў!) Але калі вы не ўпэўнены ў сваіх сілах, то лепш звярнуцца па дапамогу да спецыялістаў.

Начальнік каравула пажарнай аварыйна-выратавальнай часці № 28 Ленінскага раёна Мінска Віктар БУНІЧ мае ў сваім актыве ўжо не адзін дзясятак абясшкоджаных небяспечных гнёздаў. Ён раіць гаспадарам дамоў уважліва сачыць за станам сваіх балконаў або гаспадарчых пабудоў — у залежнасці ад таго, у якім доме, шматпавярховым ці прыватным, вы жывяце.

— З асабістага досведу: прыкладна чатыры з кожных пяці ліквідацый гнёздаў небяспечных насякомых звязаны з тым, што даводзіцца разбіраць ледзьве не палову балкона, каб да іх дабрацца. Мы не раз здымалі навясную столь або ўздзіралі падлогу, бо інакш падлезці туды проста немагчыма. Бывалі нават выпадкі, калі восы сяліліся паміж цаглінамі ў глухіх тарцах дамоў або ў стыках паміж панэлямі ў шматпавярховіках ці на гарышчах, калі там ёсць вольны доступ на вуліцу. Тут з імі ваяваць складаней. Між іншым, мы прыкмецілі, што больш ахвотна восы ў шматпавярховай забудове селяцца там, дзе ёсць двухсхільныя шыферныя дахі. Гэта датычыцца старога жылога фонду — двухпавярховікаў або так званых «хрушчовак». А ў прыватных дамах насякомыя ўладкоўваюцца пад дахам гаспадарчых пабудоў. Пік выездаў надыходзіць у жніўні-верасні. Меншы ўсплёск актыўнасці прыпадае на перыяд канца мая — пачатку чэрвеня.

За гэты год у сталіцы ратавальнікі выязджалі на ліквідацыю небяспечных гнёздаў 38 разоў. Сярод іх — 24 асіныя, 12 пчаліных, яшчэ ў двух выпадках давялося сутыкнуцца з шэршнямі.

— У якой жа экіпіроўцы выязджаюць ратавальнікі?

— У нас ёсць спецыяльныя касцюмы, якіх не могуць пракусіць джаланосныя насякомыя. Таксама выкарыстоўваем ахоўныя пальчаткі і вялікія капелюшы з сеткамі. Аналагічнымі карыстаюцца пчаляры. На выезд абавязкова бяром з сабой спецыяльныя пыласосы. Яны ўцягваюць у сябе рой насякомых і здрабняюць іх. Пасля ў мяшок збіраецца тое, што ад іх засталося...

Віктар Буніч згадвае паказальны выпадак, які адбыўся летась. Ратавальнікам паступіла просьба ліквідаваць на балконе гняздо вос. Спярша ў разведку адправіўся інспектар раённага аддзела па надзвычайных сітуацыях, каб ацаніць абстаноўку на месцы. Ён пацвердзіў інфармацыю пра тое, што насякомыя сапраўды ёсць, а вось гнязда не відаць. Увечары прыехалі ратавальнікі і пачалі аперацыю па ліквідацыі. Яны прыўзнялі нацяжную столь і ўбачылі... велізарнае гняздо шэршняў. Яно было прылеплена да бетоннай пліты. Давялося апрацоўваць яго ядахімікатамі некалькі разоў, перш чым знішчыць і выграбці шэршняў. Гэта заняло прыблізна паўтары гадзіны.

Валяр'ян ШКЛЕННІК.

Інавацыі

«РАЗУМНЫЯ ВОКНЫ» АБАРОНЯЦЬ АД СОНЦА

Шматфункцыянальны прадмет інтэр'ера распрацавалі навукоўцы БДУ

Аўтарамі выступілі супрацоўнікі лабараторыі оптыкі кандэнсуемых асяроддзяў НДІ прыкладных фізічных праблем імя А. М. Сеўчанкі БДУ пад кіраўніцтвам загадчыка Валерыя Лапаніка.

Навацыя не мае аналагаў на постсавецкай прасторы. Падобная тэхналогія прымяняецца толькі ў КНР, але там яна даражэйшая і саступае беларускаму ўзору па надзейнасці і доўгатэрміновасці выкарыстання.

Вынаходства ўяўляе сабой вадкакрышталічныя панэлі, якія ў залежнасці ад знешніх фактараў з празрыстых пераўтвараюцца ў матавыя і наадварот, але святлопрапушчальнасць захоўваецца ў любым стане. Кіруюцца «разумныя вокны» пераменным электрычным полем, што генерыруецца адмысловым блокам. Ён падае неабходны сігнал для пераключэння панэлі з аднаго рэжыму ў іншы.

«Разумныя вокны» можна выкарыстоўваць як альтэрнатыву звычайным шыбам. Інавацыйная распрацоўка абараняе памяшканне ад сонечнага святла: яна не дапускае пранікнення ўльтрафіялетавага выпраменьвання і часткова блакіруе інфрачырвонае. Гэта дазваляе карыстальніку адмовіцца ад штор і жалюзі.

Навацыя вучоных БДУ можа служыць інфармацыйным табло, якое заменіць папяровыя цэннікі ў гандлёвых цэнтрах. Ёсць магчымасць дыстанцыйна змяняць цану і найменне тавару па ўсім гандлёвым пункце з цэнтралізаванага блока кіравання на камп'ютары.

Таксама спецыфіка «разумных вокнаў» дазваляе прымяняць іх у якасці аўтамабільнага сонцаахоўнага брыля і табло на панэлі кіравання. Пры пападанні сонечнага святла адбываецца аўтаматычнае зацямненне месца на брылі, куды накіраваны погляд кіроўцы. Гэта функцыя падтрымліваецца за кошт электронікі, якая сочыць за вачыма, і праграмнага блока кіравання.

Канкурэнтнымі характарыстыкамі вокнаў з'яўляюцца таксама тэрмін службы больш за дзесяць гадоў, магчымасць вырабу на гнуткіх падкладках, павышаная ўстойлівасць да перападаў тэмператур, эканомнае спажыванне электрычнасці.

Галіна прымянення «разумных вокнаў» можа быць пашырана за кошт выкарыстання іх унутры офісных памяшканняў, у самалётах і г. д.

Надзея НІКАЛАЕВА.

ШТО ЛЮДЗІ ПІШУЦЬ ШТО ЛЮДЗІ ПІШУЦЬ ШТО ЛЮДЗІ ПІШУЦЬ ШТО ЛЮДЗІ ПІШУЦЬ

Ведай нашых!

КАЛІ Ў РУКАХ ІГОЛКА — НА ДУШЫ СПАКОЙ

Гэта ўжо традыцыя: штогод у Паставах адкрываўся Міжнародны фестываль народнай музыкі «Звіняць цымбалы і гармонік» і разам з ім — Горад майстроў, дзе ўсе ахвотныя маглі палюбавацца работамі слыннай вышывальшчыцы Ліліі Зарэцкай. Водгукі на іх былі самыя ўзнёслыя аж да таго, што многія тут жа даставалі кашалькі — прасілі нешта прадаць...

У гэтых выпадках майстрыха шчыра выбачалася і адмаўляла. Казала, што ўсе вышыўкі — даслоўна — «нібы дзеткі мае: як мне з імі расстацца?» Аднак калі нехта з патэнцыйных пакупнікоў (незалежна ад таго знаёмы ці ўпершыню ўбачаны), чымсьці ёй падабаўся, без шкадавання адорвала. Такім чынам велізарная колькасць работ вышывальшчыцы (толькі падушачак сотні са тры) «разышлася», апроч Беларусі, па Расіі, Літве, Латвіі, Германіі... Нават Прэзідэнту краіны, калі той наведваў Паставы, майстрыха падарыла карціну. І ўразіла сваім талентам.

Не дзіва, што з часам у «сценах» Горада майстроў Ліліі Радзівонаўне стала цесна: летась яе персанальная выстаўка заняла цэлы паверх Пастаўскага Дома рамёстваў, а яе адкрыццё сабрала і прадстаўнікоў улады, і гасцей фестывалю, і сяброў... Казачнае вышыванае дзіва захапіла тады ўсіх! І людзі, вядома ж, не маўчалі...

Фота Сяргея ВІШЫЎКАВА.

Лілія ЗАРЭЦКАЯ з гербамі пастаўскіх гарадоў-пабрацімаў.

Гаварыла і сама Лілія Радзівонаўна, што калі трымае ў руках іголку (а гэта па 8-10 гадзін у суткі, нават на бальнічным ложку) у яе заўсёды добры настрой. «Ніткі стараюся падбіраць яркія, усіх колераў вясёлкі. Адзін і той жа ўзор ніколі не паўтараю. Для мяне найвялікшае задавальненне — прыдумваць новы, а найвялікшая радасць — завяршаць чарговую работу».

Трэба сказаць, што сярод іх ёсць сапраўды маштабныя: карты краіны і Пастаўшчыны, «Вянок паэтаў — класікаў Беларусі», «Дрэва жыцця сям'і Лапачонак»... А колькі абразоў, карцін, дываноў, сурвэтак... Праўда, расказваць пра іх ці нават паказваць на фотаздымках не мае сэнсу: гэтую непаўторную прыгажосць трэба бачыць, наталяцца яе станоўчай энергетыкай і, вядома ж, разумець, што такое харастваў мог стварыць толькі шчыры, добры чалавек.

Якраз такой Лілію Радзівонаўну і ведаюць, хоць ліха яна хапіла напоўніцу: 35 гадоў працавала даяркай, рана аўдавела, адна вывела ў людзі чатырох дачушак і сына, якія сталі яе радасцю, надзеяй і апорай, мае 10 унукаў і 7 праўнукаў... Усяго на дрэве жыцця яе роду вышыта ажно 118 лісцейкаў-імён, больш за 30 — самых родных яе! І колькасць іх кожны год прыбаўляецца. Тады аб чым яшчэ можна марыць і чаго хацець?!

Аднак жаданне ў майстрыхі было: адкрыць музей вышыванкі, сабраць разам свае работы, каб засталіся спадчынай не толькі дзецям, унукам ды праўнукам, але ўсім добрым людзям. І вось...

Мары сапраўды збываюцца: такі музей адкрыўся ў адным з пакояў мясцовай школы, за што майстрыха асабліва ўдзячная намесніку старшыні райвыканкама Юрыю Кісялёву, старшыні Навасёлкаўскага сельскага Савета Канстанціну Мядзведзеву, дырэктару мясцовай школы Валянціне Пяткевіч і яе мужу Генадзю, работнікам Старадворскага лясніцтва...

Першымі наведвальнікамі музея аднаго творцы сталі вучні школы. Але ён, без сумнення, прыцягне ўвагу і дарослых: аграгарадок Навасёлкі-1, дзе жыве майстрыха, знаходзіцца на турыстычным маршруце. А музеяў такіх у краіне, відаць, няшмат?

Фаіна Касаткіна,

г. Паставы.

Рабі як мы

«А ПА ЗЯМЛІ ЎСЁ СЦЕЛЮЦЦА ДАРОГІ...»

Лета — цудоўная пара! І не толькі ў прыродзе, — у нашым жыцці. Ад кожных канікул я чакаю чагосьці новага, нават незвычайнага: новых ведаў, новых уражанняў... Тым больш што для гэтага створаны ўсе ўмовы: дома — бацькамі, у школе — настаўнікамі.

Сёлета свой выбар я спыніў на гуртку «Юныя турысты». Пазнаёміўся з праграмай, парадаваўся, што змагу больш даведацца пра сваю малую радзіму, што падарожнічаць па ёй буду разам з сябрамі.

Але ж спачатку ў нас былі заняткі па правілах бяспечных паводзін, па тэхніцы руху ў калоне...

І вось мы ўжо коцім па дарогах сваёй Бацькаўшчыны! Шкадуем, вядома ж, што праз пандэмію абмяжоўваем сваю дзейнасць, але нават у гэтых умовах цікава праводзім час: вывучаем геаграфію і гісторыю населеных пунктаў, ландшафты сваёй мясцовасці, гісторыю іх паходжання і змянення — у тым ліку пад уздзеяннем чалавека...

Новыя нязвыклыя ўмовы дазваляюць нам лепш разумець адзін аднаго, а гэта не толькі збліжае, але і яднае, робіць нас больш адказнымі, развівае пазнавальную актыўнасць ды самыя станоўчыя якасці.

Іншымі словамі, адчуўшы асалоду ад зносін і перамены месцаў, ад новых ведаў і краявідаў, я ўсіх запрашаю ў нашы рады — рады падарожнікаў і краязнаўцаў.

Павел Ганчар, вучань Дварэцкай СШ,

Дзятлаўскі раён.

Перажытае — незабытае

Мала патрабаваць, трэба яшчэ і паважаць

З дзяцінства я ўяўляла сябе настаўніцай. Старэйшы брат Даніла надарыў, помню, гумавых лялек, і я не проста карміла ды паіла іх — патрабавала сядзець роўненька, слухаць уважліва і запамінаць...

Маці старалася ва ўсім падтрымліваць мяне, падахвочваць да нейкіх цікавых спраў. Дагэтуль помню, як яна вучыла мяне разгадваць загадкі. Адкуль яна іх ведала (прычым столькі) — для мяне засталося дзівам, бо ні чытаць, ні пісаць, ні нават распісвацца мама не ўмела. А вось мяне вучыла, і найперш — думаць.

У памяці і татавы заданні. Элементарнае: неяк ён (стары ўжо, я ў яго позняе дзіця) папрасіў прынесці вады. Я пабегла да калодзежа, выцягнула яе, хуценька ўнесла ў хату і паставіла вядро на ўслончык. Брат, які сядзеў побач з татам, падхапіўся, набраў у кубак вады, падаў... Тата выпіў і падзякаваў брату, а мне зрабіў заўвагу: маўляў, пачатую справу трэба заўжды даводзіць да канца.

Шмат падобных урокаў я атрымала ў дзяцінстве. А колькі цікавых казак пачула! У татавай галаве (было такое ўражанне) героі іх збіраюцца разам, кантактуюць, а потым пачынаюць новае жыццё — недзе сур'ёзнае, а недзе і смешнае. Слухаючы тату, усе здзіўляліся, што ён, таксама непісьменны, можа так прыгожа расказваць!

Гэтыя ды іншыя «дамашнія ўрокі» моцна запалі ў маю дзіцячую душу і абярнуліся тым, што ў 1952 годзе я паступіла на завочнае аддзяленне філалагічнага факультэта Магілёўскага педінстытута і ў час экзамену па замежнай мове так свабодна чытала і пераказвала на рускую артыкул з нямецкай газеты, што камісія параіла мне звярнуцца ў Бабруйскі абласны аддзел народнай асветы — пашукаць пасаду настаўніцы.

Мне пашчасціла: я атрымала накіраванне ў Віркаўскую сямігодку, дзе дырэктарам быў Міхаіл Пятровіч Лапацін. Ён скончыў духоўную семінарыю, валодаў пяццю мовамі... Мяне ж «нагрузіў» гадзінамі нямецкай і малявання ў 5-6-х класах ды класным кіраўніцтвам у 5-м. Пры гэтым, праўда, пашкадаваў, што маладыя настаўнікі цяпер не затрымліваюцца, ім цяжка: вучні ў класах (рэха вайны) вельмі розных узростаў. «Вашаму Яўгену пятнаццаць, — паведаміў дырэктар. — Вы з ім амаль равеснікі...»

З гэтым Яўгенам я і сапраўды нацярпелася: ён не толькі не слухаў і не працаваў на ўроках, а проста зрываў іх. І аднойчы маё цярпенне лопнула: я рашуча накіравалася да яго — паклікала разам са мною выйсці з класа.

Дзеці чакалі, што я павяду Яўгена да дырэктара, якога вельмі паважалі, прычым усе: настаўнікі, вучні, іх бацькі...

Зрэшты, яны, вяскоўцы, як я адчувала, з павагай прынялі і мяне, бо я не толькі з ахвотай дапамагала ва ўсім гаспадыні, у якой жыла на кватэры, ды іншым адзінокім жанчынам, але і кожны дзень бегала па пяць кіламетраў...

Але ж гэта — людзі дарослыя, іншая рэч — цяжкі падлетак. Што з ім рабіць?

Ідэя — і, можна сказаць, дзіцячая — нарадзілася імгненна.

— Ты лічыш сябе дарослым? — спытала я Яўгена. — Хочаш быць лідарам?.. А давай наперагонкі — да той бярозы і назад. Хто пераможа, той у класе і лідар. Па руках?

Хлопец, амаль на галаву вышэйшы за мяне, быў упэўнены, што выйграе, аднак ён прайграў і больш ніколі не перашкаджаў мне весці ўрокі.

Затое Шура... І зноў праблема! І зноў не знайсці падыход!

Але ж неяк я папрасілася на ўрок рускай мовы, які вёў сам дырэктар. Міхаіл Пятровіч з відавочным задавальненнем прывёў мяне ў клас, пасадзіў на задняй парце побач... з тым самым Шурам. Вучні пісалі дыктоўку. А гэта ж у нашай беларускай мове як чуецца, так і пішацца, а ў рускай паспрабуй яшчэ разбярыся, дзе «а» напісаць, а дзе «о»! Шура ўвесь час «тармазіў». Я — неўпрыкмет падказвала. Справа пайшла весялей, і Шуру, бачу, яна спадабалася, а вось Міхаілу Пятровічу...

Шчыра кажучы, думала, што ён будзе сварыцца. І як жа памылілася!

— Вы б бачылі, — расказваў потым дырэктар, — якое шчасце было ў Шуры, калі ён атрымаў «пяцёрку», калі я пры ўсіх вучнях сказаў, што найлепш з дыктоўкай справіліся толькі двое — ён і выдатнік Валера Эстрын...

З таго часу Шура назаўсёды стаў маім сябрам. А галоўнае, адчуўшы смак перамогі, узяўся за вучобу, за кнігі...

Увесь свой вольны час я тады праводзіла з дзецьмі. Разам з імі, апроч іншага, мы рыхтавалі канцэрты, выступалі перад вяскоўцамі, і якія ж удзячныя ў нас былі гледачы!..

Карацей, два гады ў Віркаве ўспамінаюцца мне з незвычайнай цеплынёй.

Тады спытаеце: чаму толькі два?

Таму што наш Міхаіл Пятровіч меў неасцярожнасць так расхваліць мяне на жнівеньскай нарадзе, што начальства зрабіла высновы — накіравала мяне дырэктарам Баркоўскай сямігодкі ў тым жа Клічаўскім раёне.

...Даўно гэта было, але ж сакрэт поспеху настаўніка застаўся, па-мойму, ранейшы: трэба любіць прадмет, які выкладаеш, любіць дзяцей, трымацца формулы Макаранкі: «Як мага больш патрабавальнасці да вучня і як мага больш павагі да яго». Чаго і хочацца пажадаць усім, хто працуе па гэтай прафесіі, усім, хто толькі выбірае яе.

В. Д. Сазонава,

Мінскі раён.

Смех смехам

У КУМЫ НЕ ПРАПАДЗЕ...

Людзі кажуць, што любоў прыходзіць і сыходзіць, а есці хочацца ўвесь час.

І сапраўды, у краму народ сышоўся, каля мясных паліц «затармазіў» — стаў углядацца, выбіраць, а потым прасіць узважыць для сябе хто мяса і дарагой каўбаскі, хто «доктарскай» ці ліверкі. Прычым у апошнім выпадку кожны чамусьці тлумачыў, што купляе для сабачкі ці ката.

...Дзядзька Мікола таксама ліверку браў. І таксама казаў, што гэта — для... козачак.

Так ён сваіх «дзяўчат» называе — жонку з унучкамі. Але ж не ўсе гэта ведаюць, таму праз пару дзён мая знаёмая пытаецца:

— А ты ці чула, што Мікола коз развёў, што ён іх ліверкай корміць?

...Праўду кажуць: у кумы не прападзе, не пачуе, — прыкладзе.

С. Я. Атрохава,

Слуцкі раён.

Пошту чытала Валянціна ДОЎНАР.

Вядучая рубрыкі Алена КРАВЕЦ.
Тэл. (017) 287-18-36.

МАЛЕНЬКІЯ ДЗЕТКІ — МАЛЕНЬКІЯ БЕДКІ?

Аказваем першую дапамогу пры траўмах

Дастаткова часта дзеці трапляюць у крытычныя сітуацыі праз сваю цікаўнасць і павышаную актыўнасць. У некаторых выпадках гэта прыводзіць да вельмі сумных наступстваў. Практычна заўсёды аказанне першай дапамогі пацярпеламу малому кладзецца на плечы перапалоханых бацькоў. У такой сітуацыі галоўнае — не панікаваць і правільна выконваць медыцынскія маніпуляцыі. Як гэта неабходна рабіць, расказаў дзіцячы ўрач-хірург 3-й гарадской дзіцячай клінічнай паліклінікі Мінска Вадзім ПРАТАСАВІЦКІ.

Адна з самых распаўсюджаных сітуацый — ***дзіця ўдарылася галавой.***

— Калі ўдар быў дастаткова моцны, неадкладна звяртайцеся па ўрачэбную дапамогу. Да прыходу медыкаў пакладзіце дзіця ў ложак і забяспечце яму спакой. І нават пры поўнай адсутнасці сімптомаў, якія могуць напалохаць, уважліва паназірайце за дзіцем пару дзён. Страсенне можа праявіцца праз некаторы час рэзкай стратай прытомнасці ці парушэннем каардынацыі, — тлумачыць Вадзім Аляксандравіч. — Дзіцяці варта некаторы час устрымлівацца ад фізічнай актыўнасці і эмацыянальных нагрузак. Памятайце, што страсенне, перанесенае на нагах, прыводзіць да вельмі цяжкіх наступстваў у будучыні.

Пры іншых траўмах варта таксама адразу звяртацца ў медустанову ці выклікаць хуткую дапамогу. Пры першых прыкметах пералому ў дзіцяці гэта важна зрабіць як найхутчэй.

— Далёка не ўсе пераломы суправаджаюцца рэзкім болем. Напрыклад, зламанае рабро можа крыху паныць і перастаць, што вядзе ў будучым да няправільнага зрашчэння. Таму пры неабходнасці ўрач накіруе на рэнтген, каб перастрахавацца, — адзначае хірург.

Пры яўным пераломе не варта нічога рабіць да прыезду хуткай дапамогі. Сваімі няўмелымі дзеяннямі вы можаце зрушыць зламаныя косці, што ўскладніць іх далейшае зрастанне. Для аблягчэння болю можна выкарыстаць анальгетыкі ў належнай дазіроўцы.

Калі дзіця моцна ўдарыла сустаў, найперш прыкладзіце да яго холад на 20 хвілін. Лепш за ўсё падыдзе напоўнены лёдам пакет. Пасля нанясіце на выцятае месца мазь для зняцця болю, ацёчнасці і запаленчага працэсу.

Калі траўма выклікала пашкоджанне звязак, траўматолагі рэкамендуюць выкарыстоўваць тугую павязку ці гіпсаванне для таго, каб абезруховіць траўмаваную канечнасць. Часам на каленны ці локцевы сустаў накладваюць жорсткі фіксатар.

Калі малое пры падзенні рассекла скуру, і ў яго выступіла кроў, абавязкова апрацуйце рану перакісам вадароду, накладзіце стэрыльную павязку з антыбактэрыяльнай маззю. Калі кроў не спыняецца, варта адвезці дзіця ў траўмапункт ці бальніцу, дзе яму акажуць неабходную дапамогу.

Пры сур'ёзных апёках, калі пашкоджана вобласць галавы ці значная частка скурнага покрыва, неадкладна выклікайце хуткую дапамогу. Дайце дзіцяці абязбольвальныя, каб папярэдзіць болевы шок.

Калі апёк невялікі, рэкамендуецца апусціць пашкоджанае месца ў халодную ваду. А пасля гэтага апрацаваць яго мяккім сродкам на аснове пантэнолу.

— Такія лекі знімаюць запаленчы працэс, змякчаюць і дэзынфіцыруюць скурнае покрыва. Не трэба прымяняць пры апёках алеі, бо яны пакрыюць пашкоджанае месца своеасаблівай плёнкай, не даючы яму нармальна астыць і зажыць, — тлумачыць урач.

Яшчэ адна небяспечная сітуацыя — дзіця праглынула лекі. Трэба як мага хутчэй выклікаць у яго рвоту, даўшы папярэдне папіць паболей вады. Рвоту выклікаюць, засунуўшы абгорнутыя бінтам пальцы ў рот і націскаючы на корань языка.

— Адразу ўдакладніце, што за лекі і ў якой колькасці праглынула дзіця. Хуткая санлівасць, слабасць ці наадварот, рэзкае ўзбуджэнне — прыкметы атручэння. Неадкладна выклікайце хуткую дапамогу, — папярэджвае суразмоўнік.

Пры ўзнікненні насавога крывацёку ў дзіцяці зацісніце яму крылы носа, а на пераносце пакладзіце што-небудзь халоднае. У ноздру, якая крываточыць, пакладзіце ватны кавалачак, змочаны ў перакісе вадароду. Калі крывацёкі ўзнікаюць часта, пастарайцеся засцерагчы малога ад стрэсаў, рэзкіх рухаў і розных перажыванняў.

У ПРЫРОДЫ НЯМА ДРЭННАГА НАДВОР'Я?

Як перажыць непагадзь метэазалежным

Варта небу пацямнець ад набеглых хмар, як чалавек скардзіцца на галаўны боль ды страту сіл, нават кажа, што можа страціць прытомнасць. У кожнага з нас ёсць такія знаёмыя. А магчыма, вы і самі пазнаеце сябе: ламоту ў касцях ці цяжар у галаве часам нічым іншым растлумачыць нельга, як толькі зменай надвор'я.

Метэазалежнасць — гэта хвароба ці ўсё ж прыдумка і спосаб нічога не рабіць? Як на нас уплываюць розныя прыродныя з'явы? Каму варта быць асцярожным падчас рэзкага пахалодання, а хто, наадварот, дрэнна сябе адчувае ў спёку? Ці можна пазбавіцца ад метэаадчувальнасці і што рабіць, каб яна менш псавала жыццё? Пра гэта і іншае расказала тэрапеўт медыцынскага цэнтра «ЛОДЭ» Марына КАЖАДУБ.

— Марына Валер'еўна, метэазалежнасць — гэта рэальная праблема або плод фантазіі занадта ўразлівых асоб?

— Варта пачаць з вызначэння метэазалежнасці. Такі тэрмін сапраўды існуе. Гэта нетыповая рэакцыя арганізма чалавека на пэўныя з'явы надвор'я. Яны самыя розныя — змяненне атмасфернага ціску, тэмпературы, сонечная актыўнасць, моцны вецер. Такая праблема актуальная для, бадай, траціны насельніцтва.

— Хто найчасцей пакутуе ад метэазалежнасці?

— У большай ступені жанчыны, што звязана з асаблівасцямі гарманальнай сістэмы, а таксама людзі, якія маюць сардэчна-сасудзістыя хваробы, вегетасасудзістую дыстанію, захворванні суставаў або доўга лечаць траўмы, таксама пажылыя людзі.

— Як метэазалежнасць праяўляецца?

— Варта заўважыць, што абсалютна ўсе мы схільныя да рэакцыі на змяненне ўмоў надвор'я. Але ў здаровых людзей гэта адбываецца незаўважна, бо іх органы і сістэмы вельмі хутка адаптуюцца да знешніх абставін. А ў пацыентаў з хранічнымі хваробамі такая адаптацыя цяжэйшая.

Самая частая скарга метэазалежных людзей — галаўны боль. Ён можа быць звязаны са зменамі артэрыяльнага ціску — павышэннем ці паніжэннем. Калі халоднае надвор'е, больш пакутуюць гіпертонікі. Звычайна пры зніжэнні тэмпературы паветра ў іх павышаецца артэрыяльны ціск за кошт таго, што сасуды звужаюцца і павялічваецца нагрузка на сэрца. Супрацьлеглая сітуацыя з гіпатонікамі. Яны горш пераносяць спёку, калі атмасферны ціск падае. У такім выпадку сасуды расшыраюцца і зніжаецца артэрыяльны ціск.

— Сёлетняй вясной былі ваганні тэмпературы — ад холаду да раптоўнага цяпла. Хто адчуваў сябе дрэнна ў такіх умовах?

— Павышэнне тэмпературы і зніжэнне атмасфернага ціску ўплывае на людзей з сардэчна-сасудзістымі хваробамі. Горш адчуваюць сябе гіпатонікі.

— Калі мы закранулі атмасферны ціск, то раскажыце, як уплываюць на нас яго змяненні.

— Нармальны атмасферны ціск вагаецца ад 750 да 760 мм рт. сл. Гэта сярэднія лічбы, і яны залежаць яшчэ ад часавога пояса, вышыні над узроўнем мора. Цягам сутак атмасферны ціск, натуральна, мяняецца. Калі гэтае ваганне не перавышае 3-5 мм рт. сл., то мы яго не заўважаем, і наша самаадчуванне не мяняецца. Калі ж ваганне большае за 8-10 мм рт. сл., то многія гэта адчуваюць. Найбольш часта такія змены атмасфернага ціску, а таксама рэзкія скачкі тэмпературы паветра адбываюцца ў міжсезонне — вясной і восенню. І ад гэтага найбольш пакутуюць пацыенты з вегетасасудзістымі дыстаніямі. У іх узмацняюцца дэпрэсіі, з'яўляюцца неўрозы, галаўны боль, пераднепрытомнасныя станы.

— Змяненні атмасфернага ціску ўплываюць на ціск артэрыяльны?

— Так, пры зніжэнні атмасфернага ціску зніжаецца і артэрыяльны. Гіпатонікі горш пераносяць зніжэнне атмасфернага ціску. Гіпертонікі, наадварот, дрэнна рэагуюць на яго павышэнне. У іх артэрыяльны ціск павышаецца яшчэ больш, існуе небяспека гіпертанічных крызаў і іншых сардэчна-сасудзістых катастроф — інфарктаў і інсультаў. Таму ў зімні час, калі адбываецца павышэнне атмасфернага ціску, часцей за ўсё здараюцца такія сітуацыі.

— Некаторыя людзі змены надвор'я «адчуваюць касцямі». Растлумачце, што гэта значыць.

— Гэта адбываецца ў халоднае надвор'е пры высокай вільготнасці. У такіх людзей узмацняюцца болі ў суставах. Але яны з'яўляюцца не ва ўсіх, а менавіта ў тых пацыентаў, якія маюць захворванні суставаў — артрозы, артрыты, рэўматычныя хваробы. І пасля траўмаў, канешне. Тады болі ўзмацняюцца пры змяненні надвор'я. У кагосьці пачынае балець напярэдадні, у некага — падчас перамены надвор'я.

— Змяненні магнітнага поля, ці так званыя магнітныя буры, могуць уплываць на наш стан?

— Магнітныя буры таксама ўплываюць на наша самаадчуванне. У першую чаргу адбываецца змяненне параметраў крыві — павялічваецца яе вязкасць і замаруджваецца цячэнне. У сувязі з гэтым горш забяспечваюцца крывёй перыферычныя органы і тканкі. Чалавек можа адчуваць санлівасць, галаўны боль, раздражнёнасць, павышаную нервовасць.

— Яшчэ адна з'ява — моцны вецер. Кажуць, што ён можа быць прычынай мігрэняў.

— Так. Гэта адбываецца з-за раздражнення паверхневых рэцэптараў галавы. Пры схільнасці да мігрэняў моцны вецер можа іх правакаваць.

— Як палепшыць адаптыўныя здольнасці свайго арганізма? Ці лечыцца метэаадчувальнасць і як з ёй змагацца? Ці можна неяк падрыхтавацца да змен надвор'я?

— Цалкам пазбавіцца ад метэазалежнасці наўрад ці атрымаецца. Але палепшыць стан магчыма. Для маладых людзей у асноўным агульныя рэкамендацыі — найперш здаровы сон у дастатковай колькасці: 6-8 гадзін. Пакой перад сном неабходна праветрыць, каб сон быў глыбокі, без прабуджэнняў. Важнае і рацыянальнае харчаванне з вялікай колькасцю садавіны і агародніны. Рацыён павінен складацца з лёгказасваяльных прадуктаў, не ўжывайце ніякай цяжкай ежы, бо арганізм і так перажывае нагрузку падчас гэтых з'яў надвор'я.

Не лішнім будзе захоўваць пітны рэжым — піць дастатковую колькасць вадкасці. Асабліва гэта датычыцца тых жа магнітных бур, калі павялічваецца вязкасць крыві. Звычайна патрабуецца да двух літраў у суткі, калі няма супрацьпаказанняў — высокага артэрыяльнага ціску, захворванняў нырак, пры якіх рэкамендавана абмяжоўваць ваду і іншыя напоі. У перыяд неспрыяльных умоў надвор'я гіпатонікам можна парэкамендаваць прымаць адаптагены кшталту жэньшэню, эхінацэі. Гіпертонікам пры неабходнасці можна павялічыць дазіроўку антыгіпертэнзіўных прэпаратаў, каб не было гіпертанічных крызаў. Важна выключыць з рацыёну каву, моцную гарбату, салодкае. Гіпатонікаў гэта таксама датычыцца, бо такія прадукты ўзбуджаюць нервовую сістэму.

Пры схільнасці да мігрэняў у моцны вецер лепш насіць галаўны ўбор і прыкрывацца, напрыклад, капюшонам. А што датычыцца людзей з хранічнымі захворваннямі, то ў першую чаргу важнае іх лячэнне, каб не дапусціць абвастрэнняў і крытычных станаў. Гэта абавязковае рэгулярнае выкарыстанне базіснай тэрапіі пры сардэчна-сасудзістых хваробах, бранхіяльнай астме, захворваннях суставаў. Ну і неабходна выключыць алкаголь і курэнне — гэта датычыцца ўсіх.

— Ці могуць паўплываць на стан фізічныя нагрузкі?

— Яны не павінны быць празмернымі, непажаданая і цяжкая фізічная праца. А вось хада перад сном вітаецца.

Па палічках

ЧЫМ «ПАДКАРМІЦЬ» ІМУНІТЭТ?

Моц нашага «шчыта ад вірусаў» напрамую залежыць ад таго, што знаходзіцца ў нас на талерцы

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Колькі піць вады ў суткі, пытанне спрэчнае. Нават Сусветная арганізацыя аховы здароўя не дае дакладных рэкамендацый. На гэтую велічыню ўплываюць многія фактары: фізічны і фізіялагічны стан чалавека, узрост, тэмпература паветра, склад рацыёну, звычкі... Лічыцца, што чалавеку неабходна не менш за 25 мл на кілаграм вагі ў суткі. Лічба можа даходзіць да 60 мл, але гэта максімум.

Здаровы кішэчнік — моцны імунітэт

Прадукты, багатыя на клятчатку — гародніна і садавіна — на другім месцы па станоўчым уплыве на імунітэт.

— Прыкладна 80 % нашага імунітэту засяроджана ў кішэчніку — там знаходзіцца кішэчна-асацыіраваная лімфоідная тканка. Гэта складаная канструкцыя, якая клапоціцца аб правільнай рэакцыі арганізма на вірусы, бактэрыі і іншыя атакі. Прадукты, багатыя на клятчатку, поліфенолы, пекцін, вітаміны розных груп, ствараюць і падтрымліваюць нармальную мікрафлору кішэчніка.

Але далёка не любая садавіна і гародніна здольныя падтрымаць імунітэт. Калі плады знялі няспелымі і яны даспявалі ў працэсе транспарціроўкі, наўрад ці яны здольны прынесці арганізму карысць. Калі казаць пра падтрымку імунітэта, маюцца на ўвазе сезонныя гародніна і садавіна, да якіх наш арганізм генетычна схільны — у ідэале гэта плады, што выраслі без выкарыстання хімічных угнаенняў і сродкаў аховы ў радыусе 100—150 км ад вашага месца пражывання.

— Значыць, садавіну і гародніну купляем на сезонных рынках?

— Тая ж бабуля магла вырасціць крамяныя яблычкі паблізу трасы, і тады ў іх будуць таксічныя элементы. Лепш за ўсё, зразумела, агародніна і садавіна, якія вы вырасцілі сваімі рукамі на ўласным прысядзібным участку. Калі ж вы набываеце іх на рынку, спытайце ў прадаўца аб дакументах, якія пацвярджаюць якасць, а гэта часцей за ўсё дэкларацыя адпаведнасці менавіта на гэтую партыю і гэты від прадукцыі. Згодна з заканадаўствам, усё, што прадаецца на рынках, павінна мець сертыфікат або дэкларацыю адпаведнасці. У дакуменце пазначаюцца выпрабаванні для гэтага віду прадукцыі згодна з патрабаваннямі нарматыўнай прававой дакументацыі, а таксама тое, што паводле гэтых выпрабаванняў прадукт адпавядае ўсім заяўленым нормам.

Штодня неабходна ўжываць не менш за 400 г агародніны і садавіны мінімум пяці відаў, падкрэсліла спецыяліст. Прычым бульба сюды, на жаль, не ўваходзіць.

— Наш нацыянальны каранеплод — вельмі вугляводны прадукт. Гаворачы аб агародніне, я маю на ўвазе буракі, моркву, капусту. Актыўнасць у дачыненні да абароны ад вірусаў даказаў кверцецін. Гэтае біялагічна актыўнае рэчыва змяшчаецца ў зялёным і жоўтым перцы (чырвоны перац валодае імунамадуляцыйнымі ўласцівасцямі ў значна меншай ступені), а таксама ў спаржы, вішні, каперсах. Акрамя таго, я рэкамендую ўключыць у рацыён у эпідэмічны перыяд чырвоныя і зялёныя водарасці — у іх змяшчаецца грыфітсін, які даказаў супрацьвірусную эфектыўнасць (гэта, напрыклад, японская салата «Чука», марская капуста). З садавіны імунітэт у найбольшай ступені ўмацоўваюць кіслыя яблыкі.

У эпідэмічны перыяд варта ўжываць цыкорый і тапінамбур — у іх утрымліваецца інулін, неабходны для здароўя страўніка і кішэчніка. А таксама прадукты, якія змяшчаюць пра- і прэбіётыкі. Кісламалочныя прадукты аказваюць станоўчы ўплыў на натуральную флору кішэчніка за кошт утрымання лактабактэрый.

Горкае і кіслае

Часнок і цыбулю многія стагоддзі выкарыстоўваюць для прафілактыкі і лячэння вострых рэспіраторных інфекцый. Гэтая гародніна ўтрымлівае аліін, які пры разразанні цыбуліны або долькі часнаку ператвараецца ў аліцын — рэчыва, якое называюць прыродным антыбіётыкам. Яно захоўваецца ў крыві і страўнікавым соку, мае высокую актыўнасць супраць бактэрый і сапраўды ўмацоўвае імунітэт. Але як гэта рэчыва ўзаемадзейнічае з вірусамі, пакуль вывучана недастаткова.

Імбір — яшчэ адзін прадукт, які традыцыйна лічыцца імунамадулятарам. У ім шмат аскарбінавай кіслаты, вітамінаў А і групы В, цынку, калію, ёду, прыродных антыбіётыкаў і антыгрыбковых элементаў.

— Чэмпіён сярод спецый па імунамадуляцыйных уласцівасцях — куркума. Яе актыўнае рэчыва куркумін — магутны імунны стымулятар і прыродны антыбіётык, які перашкаджае ўзнікненню бактэрыяльных ускладненняў пры вірусных інфекцыях, — адзначае суразмоўніца.

— А што вы скажаце пра лімоны, якія традыцыйна ўключаюць у рацыён пры прастудах?

— Эфектыўнасць лімонаў пры прастудзе звязана з утрыманнем у гэтым плодзе аскарбінавай кіслаты ў адмысловай форме. Аскарбінавая кіслата здольная аднаўляць жалеза, якое знаходзіцца ў крыві ў акісленым стане. Адноўленае жалеза ўступае ў рэакцыі, у выніку якіх утвараюцца свабодныя радыкалы. Калі вы падхапілі інфекцыю, свабодныя радыкалы дапамогуць вашаму арганізму з ёй справіцца, бо яны забіваюць усё жывое, у тым ліку вірусы і бактэрыі. Есці лімоны трэба цалкам, са скуркай. Але цытрусавыя — не адзіная і не самая багатая крыніца аскарбінавай кіслаты. У вялікай колькасці яна змяшчаецца ў чорных парэчках, шыпшыне, журавінах, квашанай капусце, балгарскім перцы, у зялёнай ліставой агародніне.

Навошта піць ільняны алей?

Для здароўя клетачных мембран арганізму неабходна Амега-3. Гэта рэчыва забяспечвае фарміраванне «будаўнічых блокаў» для вытворчасці гармонаў, што не даюць развівацца запаленчым працэсам. У суткі для нармальнага функцыянавання нашага «шчыта ад вірусаў» чалавеку неабходна 1—7 грамаў Амега-3. Атрымаць іх дапаможа ўключэнне ў рацыён марской рыбы (палтус, ласось, селядзец, тунец, макрэль і сардзіны), а таксама льнянога алею. Дарэчы, рыба (палтус, скумбрыя, траска, селядзец, тунец і печань гэтых рыб) — яшчэ і крыніца вітаміна D.

— Вітамін D — самы імунамадуляцыйны, пры гэтым 80 % насельніцтва Беларусі адчувае яго недахоп, — падкрэслівае Алена Маргунова. — У дзень важна атрымліваць не менш за 400—800 МЕ гэтага рэчыва. Іншыя крыніцы вітаміну D — яйкі, субпрадукты, лясныя грыбы і малочныя прадукты.

Простыя спосабы «забіць» свой імунітэт

Магілу свайму імунітэту сучасны чалавек капае нажом і відэльцам. І ў гэтым дасягаюць поспеху як аматары фаст-фуду, так і аматары дыет.

— Пачну з моднай цяпер **бястлушчавай дыеты**. Яна шкодзіць лёгкім не менш, чым курэнне. Без дастатковага паступлення тлушчаў у арганізм работа лёгкіх парушаецца. Недахоп тлушчаў у рацыёне прыводзіць да таго, што любая інфекцыя, у тым ліку і COVID-19, значна лягчэй пранікае ў бронхі і лёгкія. У суткі даросламу чалавеку неабходна 70-80 грамаў тлушчаў, 30 % з якіх павінны быць жывёльнага паходжання. Справа ў тым, што альвеолы лёгкіх знутры пакрытыя сурфактантам, які на 90 % складаецца з тлушчаў (фасфаліпідаў). Мала тлушчаў у рацыёне — у лёгкіх мала сурфактанта. У выніку кісларод засвойваецца дрэнна, і нават самае свежае паветра не ратуе ад гіпаксіі.

Простыя вугляводы (цукар) — звычайная для сучаснага чалавека прычына сістэмнага запалення ў арганізме. Менавіта цукар стварае глікіраваны гемаглабін, які «драпае» нашы сасуды, выклікаючы запаленне сасудзістай сценкі. Цукар вельмі любяць патагенныя бактэрыі і грыбкі кішэчніка, якія падаўляюць рост карыснай мікрафлоры. Каб атрымаць празмерную колькасць цукру, дастаткова налягаць на фастфуд, кандытарскія вырабы (асабліва з маслянымі крэмамі і напаўняльнікамі), кансервы і марынады. Дарэчы, крухмал, які змяшчаецца ў бульбе, кукурузе, бручцы, муцэ вышэйшага гатунку і белых рафінаваных крупах — гэта той жа цукар.

— Максімальная колькасць цукру, якая дапушчальная ў суткі, — дзве чайныя лыжкі, солі — палова чайнай лыжкі, — адзначае Алена Маргунова. — І гэта — уключаючы той цукар і тую соль, якія мы атрымліваем з гатовых прадуктаў.

Калі разважаць аб самых шкодных для імунітэту прадуктах, адзін з лідараў — **салодкая газіроўка**. Як правіла, гэтыя напоі ўтрымліваюць празмерную колькасць цукру. Каб вытрымаць маркетынг, вытворцы замяняюць цукар «натуральнымі цукразаменнікамі». Але ў спалучэнні з CO_2 любы від цукру раздражняе слізістую, і мы адчуваем пастаянную, некантралюемую смагу. А гэта перагружае ныркі, негатыўна адбіваецца на сардэчнай мышцы, зніжае імунітэт.

Бомба для нашага арганізма — **стравы з адначасовым высокім утрыманнем цукру, солі і тлушчу**. Каларыйныя прадукты, вэнджаніна, кансервы і марынады, рафінаваныя прадукты з перавагай насычаных тлушчаў або транстлушчаў у складзе, фаст-фуд, цукар і соль зніжаюць натуральную абарону арганізма.

— Асабліва хачу сказаць пра вэнджаніну. Гэта даволі цяжкая ежа для нашага страўніка-кішачнага тракта, якая цяжка ператраўляецца. Арганізму для актыўнай дзейнасці патрабуюцца розныя ферменты, здольныя ўступаць у складаныя біяхімічныя рэакцыі. Нейкіх ферментаў чалавеку можа не хапаць: мы ўсе розныя, у некага прысутнічаюць практычна ўсе ферменты, у кагосьці некаторыя ферменты — неактыўныя або адсутнічаюць зусім. І калі пэўных ферментаў не хапае, мы атрымліваем парушэнне абмену рэчываў і, адпаведна, падзенне імунітэту. Акрамя таго, у вэнджаніне солі звычайна значна больш, чым неабходна чалавеку. Вынік — парушэнне воднага абмену, ацёкі і праблемы з сэрцам.

Наступны прадукт, што забівае імунітэт — **кансервы і марынады**. Так-так, дамашнія закаткі: памідорчыкі-агурочкі з воцатам або лімоннай кіслатой.

— Любы марынад уплывае на pH страўніка, а пры пэўнай кіслотнасці некаторыя ферменты становяцца неактыўнымі. Адпаведна, адбываюцца парушэнні ў абменных працэсах, збой работы страўніка і кішэчніка. Я не кажу, што ад марынаваных агуркоў варта адмовіцца — проста не трэба злоўжываць імі.

Аднак, неабходна памятаць, што на імунітэт уплывае не толькі рацыён харчавання, але і мноства іншых фактараў: спадчыннасць, хранічныя захворванні, фізіялагічны стан (цяжарнасць, пажылы ўзрост, перыяд палавога выспявання і г. д.), наяўнасць шкодных звычак, дрэнная экалогія, стрэсы, бяссонніца... Будзьце ўважлівыя да свайго арганізма — і ён адкажа вам узаемнасцю: моцным імунітэтам і сіламі для жыццёвых здзяйсненняў.

Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.

Центр Промышленной Оценки
• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

Организатор аукциона	**ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Мележа, 5/2, пом. 1703**
Продавец	**ОАО «Белинвестбанк», г. Минск, пр-т Машерова, 29**
Предмет аукциона:	
Банк (здание специализированное финансового назначения), общ. пл. **2379,7 кв. м**, инв. **№ 400/С-3725**, по адресу: **г. Гродно, ул. Мицкевича, 3.** Составные части и принадлежности: подвал ((А4/к)), навес (а). Начальная цена с НДС 20 % – **3 943 572,36 бел. руб.**	
Обременение: договор аренды. Подробная информация на сайте WWW.CPO.BY	
Сведения о земельном участке: предоставлен на праве постоянного пользования общей площадью 0,1086 га для обслуживания административного здания (головной филиал по Гродненской области).	
Дополнительная информация. При приобретении предмета аукциона победитель аукциона или единственный участник аукциона заключает с Продавцом договор купли-продажи имущества, относящегося к предмету аукциона **на сумму 52 983,76 бел. руб. с НДС 20 %.** Состав имущества и цены размещены на сайте организатора торгов www.cpo.by	
Дата и время проведения аукциона: 27.07.2020 в 15.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки». **Дата и время окончания приема документов: 23.07.2020 до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки»**	
Задаток 10 % от начальной цены предмета аукциона перечисляется на р/с BY60BLBB30120191021390001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области (адрес банка: г. Минск, ул. Коллекторная, 11), БИК BLBBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»	
Срок заключения договора купли-продажи: 20 календарных дней после проведения аукциона	
Условия оплаты предмета аукциона: победитель аукциона или единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5 % (далее – единственный участник аукциона), обязан произвести оплату в размере 100 % стоимости имущества не позднее **30** календарных дней с момента заключения договора купли-продажи	
Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона, оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.cpo.by.** Передача предмета аукциона победителю аукциона (единственному участнику аукциона), заключившему договор купли-продажи, производится по акту приема-передачи в течение 10 (десяти) рабочих дней с момента полной оплаты стоимости недвижимого имущества. Победителю аукциона (единственному участнику аукциона) обратиться за государственной регистрацией перехода права собственности на недвижимое имущество после передачи ему имущества в установленном порядке. Расходы, связанные с организацией и проведением торгов, заключением (удостоверением) договора купли-продажи, в том числе оплатой государственной пошлины, государственной регистрацией договора и перехода права собственности на недвижимое имущество, а также с удостоверением сделки, включая оплату государственной пошлины, несет победитель аукциона (единственный участник аукциона), заключивший договор купли-продажи	
Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия	
Предыдущее извещение опубликовано в газете «Звязда» от 28.05.2020 г.	
Контактные телефоны	**Тел.: +375 17-280-36-37; +375 29-317-95-42. E-mail: auction@cpo.by**

Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» ИЗВЕЩАЕТ О ПОВТОРНОМ АУКЦИОНЕ

ЛОТ 3: грузовой автомобиль-платформа тентовая МАЗ 437130 332, 2009 г. в., гос. № АВ 2549-4, vin Y3M437130900002217. Начальная цена продажи лота – 9 300 руб. (девять тысяч триста рублей) с учетом НДС. Сумма задатка – 930 руб. (девятьсот тридцать рублей)

ЛОТ 5: автомобиль грузовой фургон изотермический GAZ – 33106 «Белава-420», 2012 г. в., гос. № АЕ 5429-4, vin 331040C0025325, X96331060C1023208. Начальная цена продажи лота – 12 838,16 руб. (двенадцать тысяч восемьсот тридцать восемь рублей шестнадцать копеек) с учетом НДС. Сумма задатка – 1 283 руб. (одна тысяча двести восемьдесят три рубля)

ЛОТ 6: автобус-вагон МАЗ – 241030, 2013 г. в., гос. № АК 0554-4, vin Y3M241030D0000017. Начальная цена продажи лота – 42 710,98 руб. (сорок две тысячи семьсот десять рублей девяносто восемь копеек) с учетом НДС. Сумма задатка – 4 271 руб. (четыре тысячи двести семьдесят один рубль).

ЛОТ 7: грузовой специальный подъемник гидравлический ZIL-431412, 1990 г. в., гос. № АА 0539-4, vin L2990381, подъемник ВС 22-01. Начальная цена продажи лота – 7 020 руб. (семь тысяч двадцать рублей) с учетом НДС. Сумма задатка – 702 руб. (семьсот два рубля)

Продавец – Открытое акционерное общество «Лакокраска» г. Лида, 231300, г. Лида, ул. Игнатова, 71, Тел. 8-0154-53-84-30, факс 8-0154-53-85-92

Организатор торгов – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел. 8-0152-55-87-70

Условия проведения аукциона:
- возмещение победителем аукциона (лицом, приравненным к победителю аукциона) затрат Продавца на проведение независимой оценки имущества в размере 94,29 руб.;
- возмещение победителем аукциона (лицом, приравненным к победителю аукциона) затрат Продавца на организацию и проведение аукциона, в том числе затрат по уплате вознаграждения организатору аукциона в размере 5 % от конечной цены продажи объекта.

Срок заключения договора купли-продажи – не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов. Условия оплаты – по договоренности сторон

Номер р/с для перечисления задатка – Р/с BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225

Аукцион состоится 13 августа 2020 г. в 11.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3

Порядок регистрации в качестве участника аукциона и правила проведения аукциона содержатся на сайте организатора аукциона https://grino.by/aukcion/
Объявление о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звязда» от 27.02.2020 г.

Заявления на участие принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 208, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Обед – с 12.30 до 13.18

Последний день приема заявлений – 11 августа 2020 г. до 15.00

Телефон для справок 55-87-71 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» https://grino.by/aukcion/

ЗАО «БЕЛРЕАЛИЗАЦИЯ» ОБЪЯВЛЯЕТ АУКЦИОН

Организатор торгов: **ЗАО «Белреализация»** (УНП 191113330), 220089, г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 27, тел.: (8017) 298-53-53; (8029) 690 54 09.

Продавец: **ООО «Ника эстейт»** (УНП 1930556) в лице управляющего по делу о банкротстве Частное предприятие по «Правовая компания «БелПрофКонсалт», тел. +375 (17) 241-87-66.

Повторные публичные торги в форме аукциона в процедуре экономической несостоятельности (банкротства) будут проведены **30 июля 2020 г. в 10.00** по адресу: г. Минск, ул. Уманская, 54, 4-й этаж паркинга, каб. 27.

Предмет торгов –

ПРОИЗВОДСТВЕННОЕ ПОМЕЩЕНИЕ, КАБИНЕТ,
инв. № 500/D-708025692, площадью 179,3 кв. м, расположенный по адресу: г Минск, ул. Лещинского, 14-1.
Начальная цена предмета торгов – 422 100,00 бел. руб. без НДС, шаг торгов – 21 105,00 бел. руб., задаток – 42 210,00 бел. руб.
Телефон для ознакомления и осмотра +375 29 698-53-18.

Для участия в торгах необходимо в срок с 16.07.2020 г., 09.00 по 29.07.2020 г., 17.00: 1) зарегистрироваться и подать заявку по выбранному лоту на участие в торгах на сайте BELTORGI.BY; 2) перечислить задаток по выбранному лоту на р/с BY33BPSB30121854590139330000 в ОАО «БПС-Сбербанк», код BPSBBY2X, УНП 191113330, получатель – ЗАО «Белреализация».

Организатор торгов вправе отказаться от их проведения не позднее, чем за пять дней до наступления даты проведения торгов. Торги проводятся при наличии не менее двух допущенных к участию в них участников. Победителем торгов признается лицо, предложившее наиболее высокую цену. Результаты торгов оформляются в виде протокола. Если заявка на участие в торгах подана только одним участником, торги признаются несостоявшимися. Предмет торгов продается претенденту на покупку при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов. Победитель торгов (претендент на покупку) обязан оплатить сумму фактических затрат, связанных с организацией и проведением торгов, и аукционный сбор в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов. Срок заключения договора купли-продажи и оплаты предмета торгов – 10 рабочих дней со дня проведения торгов. Извещение о ранее проведенных торгах было опубликовано в газете «Звязда» от 04.06.2020 г.

Антикризисный управляющий СООО «Копыльское производство строительных систем» – ООО «Капитал Диалог» (организатор торгов) извещает о проведении 14.08.2020 г. в 10.00 по адресу: г. Минск, ул. Тростенецкая, 5, пом. 221 открытых торгов по продаже дебиторской задолженности СООО «Копыльское производство строительных систем»:

